№ 30 (675) 11 жніўня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**«Супернік Лукашэнкі — паляк»**

Старонка 5



**Ас загінуў на вачах у жонкі**

Старонка 6



**Загадкі Крэўскага замка**

Старонка 10

**У НУМАРЫ**

**Геніюш: 100 гадоў пад забаронай**

Ёсць інфармацыя, што справу Геніюш з архіва КДБ чытаў асабіста Лукашэнка. **Старонка 11.**

**Вучыся не хачу**

На некаторыя спецыяльнасці сталічных ВНУ конкурс адсутнічаў. **Старонка 5.**

**Ці ёсць у небе зорка БРСМ?**

У кішэні прадпрымальных аферыстаў перайшлі некалькі мільёнаў бюджэтных грошай. **Старонка 13.**

**А вада там блакітная**

Крэйдавыя кар'еры на Ваўкавышчыне — адно з незвычайных месцаў краіны. **Старонка 9.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
(029) 677 00 46 www.h-t.by
УНП 590883064. Ліц. № 02310/0531453 г. МСіТ ужа. 21.09.2009 да 21.09.2014

# Адзін ці два?

Аляксандр Мілінкевіч вагаецца, ці ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. **Старонка 2.**



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

# Блізкі памочнік Навумава выліў кампрамат на чыноўнікаў

Капітан Дудкін атрымаў прытулак у «адной з краін Еўрасаюза».

На сайце Belaruspartisan.org ізноў аб'явіўся капітан Вячаслаў Дудкін. Стала вядома, што афіцэр ужо з'ехаў з Масквы, бо там яго «шукалі беларускія спецслужбы», і цяпер знаходзіцца ў бяспечным Парыжы.

## Рэха «Паляўнічай справы»

Дудкін пяць гадоў адпрацаваў у цэнтральным апараце Міністэрства ўнутраных справаў. Гомельскі выдатнік за гэты тэрмін прайшоў шлях ад шараговага супрацоўніка да выканаўцы абавязкаў кіраўніка аддзела па барацьбе з карупцыяй.

Гэты аддзел уваходзіў у склад упраўлення, якім камандаваў Віктар Ермакоў. Той самы, які быў арыштаваны па крымінальнай справе, што атрымала назву «паляўнічай».

Гаварылася пра тое, што Ермакоў даў загад сваім падначаленым з Гомельшчыны Малаеву, Баранаву і Мінянкову сабраць кампраметуючы матэрыял на супрацоўнікаў КДБ. Урэшце за кратамі апынуліся самі міліцыянты.

Ермакова і калег абвінавацілі ў перавышэнні ўлады і незаконным паляванні на рысь, пасля чаго асудзілі на тэрміны ад 3 да 4 гадоў турмы. Толькі Малаеў апынуўся на свабодзе.

Прыкладна ў гэты самы час, калі адбываліся арышты ў МУС, і выйшаў на сцэну капітан Дудкін, які перад гэтым збег у Расію. Дудкіну няма і трыццаці гадоў, ён быў адным з любімчыкаў Навумава. І міністр даручаў яму самыя важныя справы. Фактычна, малады капітан быў такім сабе ад'ютантам Навумава, яго правай рукой.

«Паляўнічую справу выкарысталі, каб схаваць карупцыю на самым версе, — казаў В.Дудкін у інтэрв'ю расійскаму часопісу «Огонёк». — Тое, чым займаліся, гэтыя пытанні зараз заблакаваныя, многія матэрыялы канфіскаваныя цягам праверкі супрацоўнікамі КДБ. Зразумела, што там сур'ёзныя кампраметуючыя матэрыялы, якія пагражалі многім высокапастаўленым супрацоўнікам КДБ і Аператыўна-аналітычнага цэнтра».

Дудкін сцвярджае, што пасля адстаўкі Навумава многія звольніліся, некаторых арыштавалі. А сам ён спачатку не разумеў той небяспекі, якая яму пагражала.

## Крымінальныя справы на палову чыноўнікаў

Тым не менш, доўгі час капітан міліцыі быў вельмі асцярожны ў сваіх інтэрв'ю. Так, справы вялі супраць высокіх чыноўнікаў, але супраць каго менавіта і за што не гаварыў. Цяпер жа ва ўцекача развязаўся язык.

У Еўропе ён адчувае сябе ў пэўнай бяспецы і мяркуе, што, калі б застаўся на радзіме, паўтарыў бы лёс Святланы Байковай.

Дудкін нарэшце расказаў, якія справы распрацоўваў ягоны аддзел. Калі гэта праўда, то спіс проста ўражвае — Віктар Шэйман, Зянон Ломаць, Уладзімір Канаплёў, Сцяпан Сухарэнка, Ігар Рачкоўскі, Вадзім Зайцаў, Наталля Пяткевіч, Алег Праляскоўскі, Іван Корж.

**Працяг на старонцы 3.**

# Адзін ці два?

**Аляксандр Мілінкевіч вагаецца, ці ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах.**

Паводле нашай інфармацыі, унутры Руху «За Свабоду» актыўна абмяркоўваецца адмова ад удзелу ў прэзідэнцкай кампаніі. Сам Мілінкевіч канчатковага рашэння яшчэ не прыняў.

Чаму Рух можа адмовіцца ад выбараў? Тут некалькі момантаў. Па-першае, так і не ўнесеныя змены ў выбарчае заканадаўства, якое б гарантавала прадстаўнікам апазіцыі удзел у працэсе падліку бюлетэняў. Па-другое, Рух не мае фінансавых сродкаў для паўнавартаснай кампаніі.

Прэзідэнцкая кампанія на валанцёрскіх пачатках — рызыкоўная справа. Нават калі і ўдасца сабраць неабходныя 100 тысяч подпісаў, то не будзе чым агітаваць.

Лідэр моладзі з Салігорска Іван Шыла лічыць, што ўдзельнічаць трэба абавязкова. «Калі не будзе Мілінкевіча, то фактычна застанецца адзін кандыдат — Някляеў. Чалавек з незразумелымі пазіцыямі па базісных пытаннях. Якое стаўленне лідэра «Гавары праўду» па Еўрасаюзе, Мытным саюзе? У яго няма яснай праграмы. Я не ведаю, на якія грошы праводзіцца гэтая кампанія. Увогуле, для апазіцыйнага асяродка «Гавары праўду» як з'ява больш разбуральная, чым стваральная. Адсутнасць у бланках Мілінкевіча будзе азначаць адсутнасць кандыдата, які б сімвалізаваў еўрапейскі выбар беларусаў. Ён ці не адзіны, які не шукае выгады ў хістаннях расійскага кіраўніцтва па Лукашэнку», — кажа І.Шыла.

Канечне, не выключаны сюрпрызы ад такіх кандыдатаў, як Андрэй Саннікаў ці Алесь Міхалевіч, але найбольш цвёрдыя пазіцыі сёння маюць якраз Мілінкевіч і Някляеў. Ды і на ўсіх папярэдніх выбарах неабходныя 100 тысяч маглі сабраць толькі па два апазіцыйныя кандыдаты.

Малаімаверна, што людзі, якія сёння падтрымліваюць Мілінкевіча, будуць працаваць на Някляева. Няўдзел у выбарах Руху «За Свабоду» можа прывесці да таго, што на выбарах ніхто не будзе паслядоўна прапагандаваць нацыянальныя і еўрапейскія ідэі.

Зрэшты, і бліжэйшыя паплечнікі ўгаворваюць Мілінкевіча ісці на выбары. Дзеянне лепшае за бяздзеянне, мяркуюць яны.

**Зміцер Панкавец**

Каментар Андрэя Дынько — **старонка 7**.

# Беларусь пазычыла яшчэ $400 млн

**шляхам выпуску дадатковых еўрааблігацый.**

Аб гэтым 10 жніўня паведаміў першы намеснік міністра фінансаў Уладзімір Амарын. Вяртаць пазыку Беларусі прыйдзецца ў 2015 годзе.

Першыя аблігацыі размяшчаліся са стаўкай купона 8,75%. Даходнасць даразмешчаных аблігацый складзе на 0,5% меней — 8,25%. Гэта значыць, што попыт на першаснае размяшчэнне быў высокі, што і дало знізіць працэнт. Тым не менш, цана такой пазыкі застаецца высознай. Да прыкладу, Германія па сваіх еўрааблігацыях плаціць на 6% менш.

Еўрабонды (еўрааблігацыі) — гэта від доўгатэрміновых каштоўных папер. Іх купляюць г.зв. «інстытуцыйныя інвестары»: страхавыя і пенсійныя фонды, інвесткампаніі.



Атрыманне грошай шляхам выпуску аблігацый — гэта камфортны для ўрада, але не самы выгадны спосаб. Сродкі ад МВФ хоць і выдзяляюцца звычайна пад не зусім прыемныя для ўрада ўмовы накшталт макраэканамічных рэформаў, выдаюцца пад нашмат ніжэйшы працэнт.

Аднак браць грошы ад МВФ у выбарчы год для адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі падавалася непрымальным. А сродкі для фінансавання дзяржаўных праграмаў былі трэба. Вось і выбралі аблігацыйны спосаб пазыкі.

**Сяргей Гезгала**

### IN MEMORIAM.

## Яўген Краскоўскі

У Карэліцкім раёне памёр Яўген Краскоўскі. Просты, сціплы дзяцюк, які любіў Беларусь, прысвячаў ёй вершы. Некаторыя з іх гучалі на радыё «Свабода», а адзін, падпісаны псеўданімам Корвін, надрукавала «Наша Ніва». Пахавалі Яўгена на могілках у суседнім Заполлі. Зямля табе пухам, Яўгене.

**Сябры-землякі**

**Ад Рэд.** «Мае вершы захаляўныя. Бо я пастух — пішу вершы ў лузе і хаваю аркушыкі з імі за халявамі ботаў», — расказваў ён нам, калі прыехаў у Рэдакцыю «НН» у 2001 годзе. Светлая памяць!

**Яўген Корвін**

***

Вось з года ў год, ад веку ў век
Блукае ў цемры чалавек.
Дарог як быццам не знаходзіць,
І вось ён ходзіць, ходзіць, ходзіць…

А ноччу — жах, страшэнны сон,
Ідзе бясконцы батальён
Барацьбітоў, што з веку
Спазналі крыўду, боль і здзек.

Я не крыўдую — продкаў боль,
Я маю хлеб, я маю соль,
Я маю працу дых сяброў,
Слоў не хапае, толькі слоў.

Пра тое, як мы з году ў год
Шукаем Волю, не прыгод.
Шукаем веру дух спакой
З узнятай горда галавой.

**Наша Ніва, №50, 10 снежня 2001 г.**

### Самае чытанае на nn.by за 4—10 жніўня

- Дзень п'янага дэсантніка, або Чаго баіцца міліцыя
- Някляеў: «Помнік Лукашэнку некалі можа стаяць»
- Геніюш: 100 гадоў пад забаронай
- Рада інтэлігенцыі з удзелам генерала вызначыла нам лідэраў
- «Супернік Лукашэнкі — паляк»
- На Кубку СНД пад Мінскам разбіўся нямецкі верталёт
- Чаму расійскія турысты едуць у Беларусь?
- Андрусь Храпавіцкі. Гамон, прайгралі выбары!
- Найбагацейшыя людзі Беларусі
- Помста за аборт?

### nn@nn.by

Зачапіў артыкул пра заяву Валерыя Грышкаўца «Ая веру Чаргінцу». Згодны поўнасцю з тым, што напісаў Кастусь Матушы ў «НН» за 14 ліпеня. Зрабіць тое, што зрабіў Грышкавец, магчыма толькі апусціўшы вочы і галаву. Назваць вершы двух вядомых паэтаў-паплечнікаў Быкава «рыфмаваным пустазвонствам» — гэта ці маразм, ці нахабства.

Бураўкін і Барадулін гоняць нечысць, набрыдзь з нашай святой зямлі. Слава ім і вялікая чэсць, удзячнасць ад усяго беларускага народа.

**Мікалай Мельнікаў, Горадня**

## Сцісла

• **Актывісты кампаніі «Гавары праўду!» распачалі збор подпісаў за вылучэнне Уладзіміра Някляева дэлегатам Усебеларускага народнага сходу.** Распаўсюджваюцца адпаведныя ўлёткі з крытыкай сістэмы вылучэння дэлегатаў на Усебеларускі сход: «Сход толькі звацца народным, насамрэч гэта быў сход начальнікаў». А народны дэлегат Някляеў збіраецца надаць увагу самым балючым праблемам нашага жыцця: «Якія рэальныя даходы насельніцтва», «Колькі мы плацім за бясплатную ахову здароўя», «Як правесці сумленныя і адкрытыя выбары».

• **Па Мінску ехаў аўтамабіль з мёртвым кіроўцам.** Аўтамабіль ВАЗ рухаўся па вуліцы Багдановіча і сутыкнуўся з «Аўдзі-100». Удар быў нямоцным, бо ВАЗ перасоўваўся з хуткасцю 20—30 км/г. За рулём сядзеў мёртвы кіроўца. 70-гадовы мужчына сканаў да ДТЗ, а не ў выніку яго.

• **Кіраўніца сталічнай гандлёвай сеткі падазраецца ў буйных крадзяжах.** 45-гадовая дырэктарка падазраецца ў тым, што на працягу двух гадоў выкрала 44 млн рублёў грошай прадпрыемства. Паводле следства, жанчына афармляла фіктыўныя дамовы падраду і забірала з касы матэрыяльныя грошы або не ўносіла ў касы выручку.

• **Каранцін Мікалая Аўтуховіча скончыўся.** Палітвязня рыхтуюць да пераводу ў 13-ы атрад івацэвіцкай калоніі №22 (Брэсцкая вобласць). Ваўкавыскага прадпрымальніка этапавалі туды з СІЗА №1 Мінска 23 ліпеня.

• **Аднавіліся здымкі эратычнага фільма «Бацькава шчасце».** Стужку задумаў скандальны расійскі прадзюсер Аляксандр Валаў. Здымкі пачаліся яшчэ ў 2006-м, але былі прыпыненыя праз адмову выканаўцы галоўнай ролі ўдзельнічаць у праекце. У той момант ён працаваў у начным клубе кіроўцам і здымкі ў эратычных фільмах лічыў дадатковым заробкам. Але пасля паказу на Першым канале ў праграме Андрэя Малахава «Няхай гавораць» фрагмента з фільма «Бацькава шчасце» выбухнуў скандал. Актора-кіроўцу звольнілі. У пракуратуры Беларусі не выключалі крымінальнай справы супраць стваральнікаў фільма за абразу кіраўніка дзяржавы. Валаў не баіцца наступстваў: «Мы здымаем не дакументальны фільм, а мастацкі. Ніякага прэзідэнта ў ім няма. Ёсць выдуманы персанаж Бацька». Раней Валаў зняў фільм пра Юлію Цімашэнка і Міхаіла Саакашвілі «Юля».

**СМ; ЮУ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

І.Д. з Мядзельскага раёна.
Іван З. з Пружанскага раёна.
А.П., Людміле П. з Брэста.
В.К., Уладзіміру К., Ліліі З., Л.Ш. з Мінскага раёна.
Уладзіславу Л. з Шаркаўшчынскага раёна.
Генадзю С., В.В. з Гродна.
Івану Л. з Вілейскага раёна.
Б.Л. з Пастаўскага раёна.

# Блізкі памочнік Навумава выліў кампрамат на чыноўнікаў

Працяг са старонкі 1.

Няўжо Навумаў насамрэч рызыкаваў пайсці супраць амаль усяго беларускага ўладнага істэблішменту? Дудкін сцвярджае, што расследаванне гэтых справаў тармазіў асабіста Лукашэнка, які нібыта нешта і дазваляў рабіць, а потым хутка забараняў.

### Катэджы спадарыні Саўчанка

Найбольш капітан прайшоўся па Віктару Шэйману. Па словах Дудкіна, былы кіраўнік Рады бяспекі зусім страціў розум ад маладой асобы па прозвішчу Саўчанка. І, калі верыць Дудкіну, міліцыя высветліла, што гэтая дзяўчына валодае некалькімі кватэрамі, а таксама чатырма загараднымі катэджамі, большымі, чым у былога начальніка ждановіцкага рынка Яўгена Шыгалава.

Па справе незаконнага выдзялення зямельных участкаў быў арыштаваны старшыня Ждановіцкага сельвыканкама Маскалёў, але вярнуць зямлю назад не ўдалося.

Супраць самой Саўчанка міліцыя здолела завесці толькі адну крымінальную справу — за падробны дыплом аб вышэйшай адукацыі. Паводле Дудкіна, дзяўчына з фальшывым дыпломам Маскоўскай акадэміі бізнесу і права ўладкавалася намеснікам генеральнага дырэктара магутнага будаўнічага холдынга «Гіперком».

Сітуацыя з Аленай Саўчанка ў нейкай ступені нагадвае сюжэт рамана Віктара Марціновіча. У мастацкім творы каханка дыктатара таксама мела катэдж у Тарасаве. Вось і ўгадай, хто ў каго спісваў: Марціновіч з рэальных падзей ці Дудкін з «Параноі»?

### Усё спіхнулі на Камарніцкага

Буйныя расходы Саўчанка тлумачыла грашовымі падарункамі з-за мяжы, збольшага, з Паўднёвай Амерыкі. Аднак давесці справу пра даходы да фіналу не ўдалося.

Дудкін кажа, што менавіта тады ён зразумеў, што вядзецца «барацьба барацьбы з барацьбой». А для ўсіх людзей, што нешта ведаюць пра акалічнасці справы, гэта скончыцца «ў лепшым выпадку эміграцыяй».

Капітан абвінавачвае і старшыню КДБ Вадзіма Зайцава, і старшыню памежнага камітэта Ігара Рачкоўскага ў карупцыі ўнутры пагранічнага ведамства. «Увесь крымінал тады спіхнулі на хворага на рак намесніка камітэта Камарніцкага, хаця многія дакументы падпісвалі Рачкоўскі і Зайцаў», — кажа Дудкін. Нагадаем, што ў сакавіку Камарніцкі за атрыманне хабару быў асуджаны на пяць гадоў, але за краты не сеў, бо ў чалавека апошняя стадыя раку.



Капітан Дудкін быў адным з любімчыкаў міністра Навумава.

### Працяг будзе?

Афіцэр расказвае пра тое, што ў распрацоўцы былі Сухарэнка, Пяткевіч, Пралляскоўскі, але не кажа пра абвінавачванні ў іх бок.

Калі журналіст спрабуе пад'ялдыкнуць Дудкіна, што ён уцяміў усё гэта цяпер, то капітан парыруе: «У фірме «Лукашэнка і сыны» я ніколі не працаваў і нічога ёй не павінен, мы проста выконвалі свой службовы абавязак». Пры гэтым сам Дудкін нядаўна прызнаваўся, што, стоячы побач з Лукашэнкам, проста млеў ад павагі да кіраўніка краіны.

У Дудкіна застаецца ранейшы сантымент да Уладзіміра Навумава. Ён малюе яго як прыстойнага і сумленнага кіраўніка, хоць у канцы крыху папракае яго за баязлівасць.

Можна меркаваць, што гэта не апошнія скандальныя прызнанні афіцэра. Хутчэй за ўсё, у яго застаецца яшчэ сякая-такая інфармацыя. Тое, што Дудкін пачаў рабіць свае прызнанні перад выбарамі, таксама характэрна.

Дарэчы, дзе гарантыя, што бліжэйшым часам з шакуючымі заявамі на адрас беларускага кіраўніцтва не выступіць сам генерал Навумаў? А такая імавернасць, сапраўды, ёсць. Былы міністр пасля адстаўкі атабарыўся ў Маскве. Ён атрымаў пасаду дарадцы Сяргея Чэмезава, генеральнага дырэктара дзяржаўнай карпарацыі «Растэхналогіі». Гэтая структура знаходзіцца пад асабістым кантролем Уладзіміра Пуціна.

**Зміцер Панкавец**

# Просьба пра міжнароднае расследаванне

Апазіцыя звярнулася ў Раду бяспекі ААН.

На мінулым тыдні быў дасланы зварот да міністраў замежных справаў пастаянных чальцоў Рады Бяспекі ААН — Кітая, Расіі, Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША.

Апазіцыйныя палітыкі просяць правесці міжнароднае расследаванне па гучных справах зніклых палітыкаў і журналістаў.

«Праваабаронцы Беларусі, адвакаты сем'яў і сваякі зніклых вычарпалі ўсе ўнутраныя, а таксама рэгіянальныя і міжнародныя механізмы прававой абароны, але не дамагліся выніку. Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які застаецца ва ўладзе з таго часу, калі адбыліся знікненні, не стварыў умоў для правядзення дакладнага і непрадузятага расследавання гэтых спраў і блакаваў спробы міжнароднай супольнасці давядацца праўду пра лёс зніклых», — пішуць аўтары звароту.

У звароце ўспамінаецца таксама прэцэдэнт стварэння Міжнароднай камісіі ААН па расследаванню забойства былога прэм'ер-міністра Лівана Рафіка Харыры.

Падпісанты спасылаюцца на даклад кіпрскага дэпутата Хрыстаса Пургурыдэса, які быў агучаны ў Радзе Еўропы. У гэтым дакладзе гаворыцца, што высокапастаўленыя чыноўнікі былі датычныя да знікненняў Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзмітрыя Завадскага.

Ліст падпісалі кандыдат у прэзідэнты Андрэй Саннікаў, былы кіраўнік Беларусі Станіслаў Шушкевіч, праваабаронца Алесь Бяляцкі, старшыня АГП Анатоль Лябедзька, лідэр посткамуністаў Сяргей Калякін, старшыня БНФ Аляксей Янукевіч, былы палітвязень Міхаіл Марыніч, лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў. Фактычна пад дакументам няма подпісу толькі аднаго ўплывовага палітыка — Аляксандра Мілінкевіча.

Тым часам маці зніклага Юрыя Захаранкі Ульяна атрымала адказ з Генеральнай пракуратуры аднosна расследавання справы. Намеснік генпракурора Віктар Конан абмежаваўся адпіскай, дзе сярод іншага зазначыў, што знікненне можа быць звязаным «у тым ліку з-за карысці, на глебе асабістых непрыязных адносінаў, у сувязі з яго палітычнай дзейнасцю».

**ЗП**

**Чаму пад зваротам няма подпісу Мілінкевіча?**

«Мілінкевічу проста ніхто не прапанаваў падпісацца», — адказалі нам у Руху «За Свабоду». І звярнулі ўвагу, што пад дакументам няма і подпісу іншага найвядомейшага лідэра апазіцыі Аляксандра Казуліна. «Гэта выглядае на спробу навыперадкі атрымаць піяр-эфект, чым рэальна паспрабаваць узняць пытанне», — дадаў наш суразмоўца.

Хто ж збіраў подпісы пад зваротам? Першым тэкст апублікаваў сайт кампаніі «Еўрапейская Беларусь», якую каардынуе Андрэй Саннікаў.

# Каардынатара «Гавары праўду» абвінавацілі ў падробцы дакументаў

7 жніўня быў затрыманы мінскі каардынатар грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду», літаратар Міхась Башура. Міліцыянты прыйшлі проста да яго дадому, але Міхась адмовіўся выходзіць.

Праз дзве гадзіны Башура мусіў выйсці з кватэры, як высветлілася, міліцыянты нікуды не падзеліся. Яны адвезлі актывіста ў Савецкі РУУС, дзе і прайшоў першы допыт. Прычым, доўжыўся ён да другой гадзіны ночы.

Пасля яго была пастанова затрымаць Башуру на трое сутак у ізалятары часовага ўтрымання на Акрэсціна. Тады ж стала вядома, што Башуру абвінавачваюць у падробцы даведкі пра даходы для атрымання крэдыту. Пры гэтым праваабаронцы кажуць, што банк не мае ніякіх прэтэнзій.

Абвінавачваюць Башуру па артыкуле 380 ч.2 КК «Падробка дакументаў, здзейсненая паўторна». Санкцыя паводле яго — да трох гадоў.

У панядзелак Башуру дапыталі паўторна. Следчы прыняў пастанову пра падоўжыць знаходжанне за кратамі да дзесяці сутак. Пры гэтым абвінавачванне актывісту прад'яўлена не было.



Да прыходу ў палітыку Міхась Башура быў вядомы як паэт.

Міхась Башура — беларускамоўны літаратар. Адзін з удзельнікаў суполкі «Бум-Бам-Літ», аўтар кнігі традыцыйнай лірыкі пад абсурдысцкай назвай «Паліванне на мух са шланга». У красавіку ўдзельнічаў у мясцовых выбарах, далучыўся да кампаніі «Гавары праўду».

Менавіта з машыны Башуры былі скрадзены подпісы за перайменаванне вуліцы ў гонар Васіля Быкава.

**ЗП**

## Сцісла

• **Аляксандр Мілінкевіч звярнуўся да палаты прадстаўнікоў.** Лідэр Руху «За Свабоду» заклікае прыняць папраўку ў Выбарчы кодэкс, якая гарантуе прадстаўнікам кандыдатаў удзел у падліку галасоў.

• **БХД канстатуе «недастатковую колькасць» сілаў для прэзідэнцкай кампаніі.** У ініцыятыўную групу па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты Віталя Рымашэўскага запісалася прыкладна тысяча чалавек. Сустаршыня БХД Павел Севярынец адзначыў, што тысяча чалавек — гэта «недастатковая колькасць». «Ініцыятыўная група павінна складаць як мінімум дзве з паловай тысячы чалавек», каб сабраць 100 тысяч подпісаў.

• **Лукашэнка павіншаваў Абаму з днём народзінаў.** «У Рэспубліцы Беларусь Вас ведаюць як прынцыповага, дальнабачнага і прагматычнага палітыка». Лукашэнка выказаў упэўненасць, што «сумеснымі намаганнямі мы зможам напісаць якасна новую старонку беларуска-амерыканскіх адносін і вывесці іх на ўзровень, які адпавядае інтарэсам народаў абедзвюх краін».

• **У Тбілісі адрэагавалі на заяву Мядзведзева аб абяцаннях Лукашэнкі.** Як заявіў напярэдадні пасяджэння грузінскага ўрада міністр рэінтэграцыі Цімур Якабашвілі, «пакуль Крэмль праводзіць палітыку прызнання грузінскіх сепаратысцкіх рэгіёнаў, Расія будзе аказваць ціск на Беларусь».

**ЗП**

# Кватэры ў Мінску ўдвая даражэйшыя, чым у Рызе

Колькі каштуе купіць ці наняць кватэру ў Мінску і суседніх сталіцах?

З пачатку года кошт мінскіх кватэр працягвае паступова змяншацца – за паўгода на 7%. Цяпер квадратны метр у сталіцы ў сярэднім каштуе $1230. Такім чынам, тыповая двухпакаёўка плошчай 50 квадратных метраў за гэты час патаннела на $4300.

А вось кошт навабудаў па-ранейшаму расце. Будаўнічы бум у гэтым сегменце і не думае знікаць. За кошт гэтага цэны на новыя кватэры цяпер абагналі цэны другаснага рынку і спакваля падбіраюцца да $1300.

Для тых жа, хто пакуль не ў стане назбіраць на ўласнае жыллё, застаюцца прапановы аб найме кватэры. Аднапакаёўка ў спальным раёне горада каштуе каля $200 за месяц.

Гэта дорага ці танна? Параўнаем мінскія цэны з такімі ж цэнамі ў суседніх сталіцах.

### Масква нізкім цэнам не верыць

Вядома ж, самым дарагім горадам на постсавецкай прасторы застаецца Масква. Расійскім шалёным цэнам крызіс – зусім не перашкода. Кошт квадратнага метра кватэры дапоўз да $4400. Гэта ў 3,5 разу больш, чым у Мінску!

Цэны на аднапакаёўкі, якія бесперапынна абжываюць усё новыя і новыя ахвотнікі ў пошуках маскоўскага шчасця, пачынаюцца ад $800 за месяц. За сярэдні ж узровень можна смела браць $950—1000. Гэта каб адносна непадалёку ад метро і не ў аварыйным доме.

### Кіеў паміж Мінскам і Масквой

Украінская сталіца ўтрымлівае за сабой упэўненае другое месца па дарагоўлі – сярэдні кошт квадратнага метра кватэры на другасным рынку Кіева складае $2100. Паказчык атрымліваецца такім высокім за кошт высокіх цэн на элітнае жыллё ў цэнтры ўкраінскай сталіцы. Але нават у самых аддаленых спальных раёнах кошты квадратнага метра перавышаюць $1650.

Цана на новабудоўлі складае $1700 за метр. А вось кошт арэнды кватэры вылічваецца па ўніверсальнай формуле – удвая танней за Маскву, удвая даражэй за Мінск. Атрымліваецца якраз каля $400.

### Вільня і Варшава трымаюцца разам

Хоць заробкі ў палякаў у 1,5 разу большыя, чым у літоўцаў – $1500 супраць $1000, – кватэры ў Варшаве і Вільні каштуюць прыкладна аднолькава.

| | Квадратны метр кватэры, $ | Арэнда адкапакаёўкі, $ | Сярэдняя зарплата па краіне, $ |
|---|---|---|---|
| Мінск | 1230 | 200 | 416 |
| Масква | 4400 | 1000 | 724 |
| Кіеў | 2100 | 400 | 292 |
| Варшава | 1450 | 380 | 1150 |
| Вільня | 1380 | 300 | 786 |
| Рыга | 750 | 300 | 818 |

**Звесткі пра сярэдні заробак — за чэрвень.**
**Курс нацыянальных валют да даляра ўзяты па стане на 9 жніўня.**

У літоўскай сталіцы квадратны метр кватэры каштуе прыкладна $1380. Што да арэнды, то кватэра без рамонту абыдзецца ў $300 за месяц, але ў гарачы сезон, як зараз, у жніўні, студэнты вымушана «паднімаюць» цэннік да $400.

Варшава жыве па залатым правіле – сярэдні заробак роўны кошту квадратнага метра. Таму і цэны ў раёне $1500. І нават крыху менш. Арэнда ж каштуе каля $380—400 за аднапакаёўку.

### Рыжскі бясцэнак

Пра цэны на жыллё ў Рызе нават пісаць сорамна. За кошт крызісу яны ўпалі да $750 за квадратны метр! Справа ў тым, што падчас фінасавага крызісу цэны зваліліся ў 1,5 разу і не вярнуліся на ранейшы ўзровень да гэтага часу. Арэнда жылля патаннела не так моцна – аднапакаўёка каштуе каля $300, — і ў гэтым заключаецца вялікая праблема для латвійскага рынку нерухомасці. Выплаты па крэдытах пры пабудове сваёй кватэры амаль роўныя кошту арэнды. Таму латвійцы масава абіраюць варыянт будаўніцтва, тым самым ізноў надзімаючы крэдытную мыльную бурбалку, што пагражае высокай інфляцыяй.

**Яўген Васількоў**

## Шыла на мыла ці сапраўды выгадны абмен?

Сідорскі пачынае праграму па замене старой бытавой тэхнікі на новую.

Прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі прапанаваў прымаць старую айчынную бытавую тэхніку ў залік куплі новай. «Давайце арганізуем збор і ўтылізацыю гэтай тэхнікі і будзем плаціць за ўтылізацыю, каб чалавек пайшоў, напрыклад, на «Гарызонт» і купіў новы тэлевізар, ЗВЧ-печ», — сказаў прэм’ер.

Паводле яго слоў, многія краіны прайшлі ўжо гэтую практыку. Сідорскі мяркуе, што такі механізм быў бы выгадным як для грамадзян Беларусі, так і для прадпрыемстваў-вытворцаў.

Прэм’ер-міністр запатрабаваў унесці на разгляд ва ўрад канкрэтную праграму па ўтылізацыі бытавой тэхнікі. Напрыклад, грамадзяніну за здачу старога халадзільніка ўмоўна можна было б плаціць 100 тысяч, але з умовай, што ён набудзе новы халадзільнік «Атлант».

Для рэалізацыі такога праекта прэм’ер-міністр прапануе актывізаваць стварэнне ў рэгіёнах Беларусі цэнтраў, якія займаліся б зборам старой бытавой тэхнікі. «У свеце вядомы тэхналогіі, калі з мікрасхем выплаўляецца золата, іншыя элементы», — сказаў Сідорскі.

**ЯВ**


МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

## Сідорскі запярэчыў Пракаповічу

Прэм’ер–міністр і старшыня Нацбанка завочна спрачаюцца, ці трэба пазычаць грошы ў МВФ.

«Беларусь гатова звярнуцца па дапамогу да МВФ у выпадку неабходнасці», – з такой заявай выступіў прэм’ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з пастаянным прадстаўніком Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі Наталляй Калядзінай. Падзякаваўшы арганізацыі за фінансавую дапамогу ў мінулым годзе, ён пахваліўся, што сумесна выбудаваная праграма па лібералізацыі паспяхова выконваецца. Напрыклад, у адпаведнасці з абавязацельствамі перад МВФ у верасні—кастрычніку адбудуцца конкурсы па продажы акцый пяці беларускіх прадпрыемстваў.

Цікава, што менш за паўмесяца таму кіраўнік Нацбанка Пятро Пракаповіч заяўляў, што сёння адсутнічае неабходнасць для прыцягнення ў Беларусь новых крэдытаў Міжнароднага валютнага фонду. «Што да абмеркавання рэальнай праграмы з МВФ і ці будзе яна, гэтае пытанне будзе вырашацца падчас наступных місій. Пакуль пытанне аб прыцягненні новых запазычанняў не абмяркоўваецца», — казаў галоўны банкір краіны. «МВФ нікому не выдзяляе рэсурсы без выканання асаблівых умоў, а гэтыя ўмовы не заўсёды садзейнічаюць эканамічнаму развіццю краіны. Таму да МВФ мала хто звяртаецца», — растлумачыў сваю пазіцыю Герой Беларусі Пятро Пракаповіч.

**ЯВ**

## Золатавалютныя рэзервы працягваюць падзенне

Нягледзячы на курортны сезон, за ліпень яны знізіліся амаль на $200 мільёнаў.

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па стандартах МВФ, на 1 жніўня склалі $5332 мільёны, што на $193 мільёны (3,5%) менш, чым у ліпені. Гэта звесткі Нацыянальнага банка. З пачатку года рэзервы краіны знізіліся на $321 мільён (5,7%).

А калі б не паступленні, якія былі залічаныя ў склад ЗВР ($625 мільёнаў за продаж акцыяў ААТ «Белтрансгаз», $670 мільёнаў крэдыту МВФ), рэзервы знізіліся б больш чым на $1,6 мільярда.

Гэта вынік вялікага дэфіцыту замежнагандлёвага балансу: краіна больш імпартуе, чым экспартуе, і вымушаная кампенсаваць розніцу або замежнымі запазычваннямі, або продажам дзяржаўнай уласнасці.

**Сяргей Гезгала**

### Сцісла

• **Сямашка: Беларусь не будзе спяшацца з продажам «Беларуськалія».** «Што да продажу пэўнага пакета акцый, то гэта магчыма», — сказаў журналістам Сямашка, адзначыўшы, што ёсць шмат ахвотных. Пры гэтым ён дадаў, што «цяпер не самы ўдалы момант для продажу». Сямашка таксама паведаміў, што Мінск не вёў перамовы аб продажы пакета акцый «Беларуськалія» з суўласнікам расійскага «Уралкалія» мільярдэрам Сулейманам Керымавым.

• **Расія прапануе Казахстану і Беларусі таксама забараніць экспарт збожжа.** Экспарт збожжа з самой Расіі забаронены праз сушу, у выніку якой шмат пасеваў загінула.

• **Сёмы танкер ад Чавэса прыплыў у Адэсу.** На борце знаходзіцца 78 тыс. т венесуэльскай нафты. Усяго да красавіка 2011-га маюць паставіць 4 млн тон нафты.

• **Запазычанасць?** Нічога страшнага. Кіраўнікі арганізацый, якія маюць запазычанасці перад дзяржавай, змогуць ізноў атрымліваць прэміі. Аляксандр Лукашэнка адмяніў свой ранейшы ўказ, які такое забараняў. Папярэдні ўказ дзейнічаў ад 1996 года. Цяперашні ўпісваецца ў палітыку лібералізацыі і флірту з менеджарамі.

• **Сярэдняя ўраджайнасць у краіне сёлета складзе між 30 і 31 збожжа з гектара.** Гэта прыкладна супадае з ураджайнасцю ў раёнах Польшчы і Літвы з аналагічнымі глебамі.

• **За сем месяцаў Нацбанк прадаў людзям 510,4 кг золата ў злітках.** Гэта на 36% менш, чым летась.

• **Сістэма венчурнага фінансавання можа запрацаваць у Беларусі з верасня гэтага года.** «Пасля гэтага супольна з зацікаўленымі структурамі — а гэта ў першую чаргу замежныя банкі і інвестыцыйныя фонды — пачнём адпрацоўваць на практыцы гэты механізм», — сказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў. З дапамогай венчурнага фінансавання будуць рэалізоўвацца праекты ў сферы вытворчасці медыцынскай тэхнікі, машынабудавання, біятэхналогій, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Венчурнае фінансаванне — гэта доўгатэрміновыя (5–7 гадоў) высокарызыкавыя інвестыцыі прыватнага капіталу ў акцыянерны капітал малых высокатэхналагічных перспектыўных кампаній (ці прадпрыемстваў), арыентаваных на распрацоўку і вытворчасць навукаёмістых прадуктаў.

• **Усё беларускае малако ў Расеі прымальнае.** Рассельгаснагляд ад 3 жніўня адмяніў раней уведзеныя абмежаванні на пастаўку ў Расею малочнай прадукцыі чатырох беларускіх прадпрыемстваў.

**СГ**

# Вучыся не хачу

На некаторыя спецыяльнасці сталічных ВНУ конкурс адсутнічаў.

Нягледзячы на меншую колькасць выпускнікоў школ, колькасць месцаў у вышэйшых навучальных установах сёлета павялічылі амаль на пяць тысяч. Праўда, большасць дадатковых месцаў — платныя. А якасць адукацыі платнікаў такая, што на ўзровень ведаў увага не звяртаецца.

### Эканоміка і правы па-ранейшаму ў модзе

Прахадныя балы і конкурсы ў ВНУ яскрава сведчаць аб модах. Чым балы вышэйшыя, тым прэстыжнейшая спецыяльнасць. Традыцыйна высокія прахадныя балы захоўваюцца на спецыяльнасці, звязаныя з эканомікай і правам.

### Настаўнікаў рыхтуюць з троечнікаў

З другога канца рэйтынгу — найменш прэстыжныя спецыяльнасці. Сярод іх — педагог. Сёлета праблемы ўзніклі ў размешчаным у Мінску Беларускім дзяржаўным педуніверсітэце імя Максіма Танка. На шэраг спецыяльнасцяў дзённай бюджэтнай формы навучання адсутнічаў конкурс. Выявіўся недахоп ахвотных стаць настаўнікамі матэматыкі, фізікі і інфарматыкі. Дастаткова было атрымаць 20 балаў па кожным прадмеце ЦТ, каб стаць студэнтам! Будучымі настаўнікамі маглі стаць нават рэальныя двоечнікі.

Затое прахадны бал на спецыяльнасць «Лагапедыя. Спецыяльная псіхалогія» быў роўны 311. Далёка не кожная ВНУ сёлета пераступіла мяжу ў тры сотні.

Нежаданне выкладаць у школах пасля атрымання дыплома стрымала абітурыентаў і ад паступлення на філфак БДУ. На асобныя яго спецыяльнасці адсутнічалі прахадныя балы — залічылі ўсіх, хто вытрымаў іспыты.

### Вучыся не хачу

У гэтым годзе не было ажыятажу на платную форму навучання. А ў некаторых ВНУ конкурс проста адсутнічаў. У Тэхналагічным універсітэце, каб стаць студэнтам дзённага аддзялення па спецыяльнасці «Біяэкалогія», дастаткова было набраць 74 балы. У БНТУ (былым Палітэху) на «Тэхналогію і абсталяванне тарфяной вытворчасці» — 79, а на спецыяльнасць «Матэрыялазнаўства ў машынабудаўніцтве» не было пададзена ніводнай заявы.

Яшчэ горшая сітуацыя ў Педуніверсітэце, дзе на большасць платных спецыяльнасцяў прахадныя балы адсутнічалі.

Ахвотных вучыцца завочна таксама было недастаткова.

Усяго з меркаваных 103 тысяч студэнцкіх месцаў сёлета занятыя толькі каля ста. Але ўжо цяпер зразумела, што патрэбнай колькасці студэнтаў не дабралі. Ды і планка з патрабаваннямі для іх ведаў у цэлым панізілася.

**Кастусь Матушыч**

**Самыя папулярныя спецыяльнасці ў 2010 годзе, дзённая бюджэтная форма**

| ВНУ | Спецыяльнасць | Прахадны бал (горад/вёска) |
|---|---|---|
| БДУ | Міжнароднае права | 369/ 348 |
| Акадэмія МУС | Судовая экспертыза (для дзяўчат) | 365 |
| БДУ | Сусветная эканоміка | 360 |
| МДЛУ | Англійская мова і другая мова са спецыялізацыяй | 355 |
| БДУ | Міжнародныя адносіны | 353 |
| БДУ | Паліталогія (палітыка-юрыдычная дзейнасць) | 348/333 |
| МДЛУ | Нямецкая мова і другая мова са спецыялізацыяй (перакладчыцкі ф-т) | 347/173 |
| БДЭУ | Міжнародныя інвестыцыі | 345 |
| МДМУ | Стаматалогія | 343/336 |
| БДЭУ | Упраўленне знешнеэканамічнай дзейнасцю | 335 |
| БДЛУ | Нямецкая мова і другая мова са спецыялізацыяй (ф-т міжкультурных камунікацый) | 333/285 |
| БДУ | Усе спецыяльнасці эканамічнага факультэта | 333/266 |
| БДЭУ | Фінансы і крэдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці | 330 |
| БДЭУ | Лагістыка | 327 |
| БДУІР | Інфарматыка | 326/318 |
| БДУ | Інфармацыя і камунікацыя | 322 |
| МДЛУ | Турэцкая мова і другая мова са спецыялізацыяй | 320/260 |
| БДУІР | Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій | 314 |
| БДУ | Псіхалогія | 313/309 |
| БДПУ імя Максіма Танка | Лагапедыя. Спецыяльная псіхалогія | 311 |

**Для параўнання: самыя папулярныя спецыяльнасці ВНУ ў 2009 годзе, дзённая бюджэтная форма**

| ВНУ | Спецыяльнасць | Прахадны бал (горад/вёска) |
|---|---|---|
| БДМУ | Стаматалогія | 359/304 |
| БДУ | Сусветная эканоміка | 357 |
| БДУ | Менеджмент (у сферы міжнароднага турызму) | 354 |
| БДУ | Інфармацыя і камунікацыі | 353/247 |
| БДУ | Міжнароднае права | 349/341 |
| БДЭУ | Сусветная эканоміка (упраўленне знешнеэканамічнай дзейнасцю) | 348 |
| БДЭУ | Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (знешнеэканамічныя сувязі) | 346/343 |
| МДЛУ | Сучасныя замежныя мовы (пераклад) (англійская мова і другая замежная) | 344 |
| БДУ | Лінгвакраіназнаўства | 344/319 |
| БДУ | Міжнародныя адносіны | 343 |
| БДЭУ | Сусветная эканоміка (міжнародныя інвестыцыі) | 343 |
| БДЭУ | Бізнэс-адміністраванне | 343/323 |
| МДЛУ | Сучасныя замежныя мовы (пераклад) (нямецкая мова і другая замежная) | 342 |
| МДЛУ | Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (англійская мова і другая замежная) | 342/319 |
| БДЭУ | Эканоміка і кіраванне турыстычнай індустрыяй (эканоміка і кіраванне гатэлямі і рэстаранамі) | 342/317 |
| БДЭУ | Фінансы і крэдыт (у знешнеэканамічнай дзейнасці) | 342/293 |
| БДЭУ | Эканоміка | 342/254 |
| БДУ | Бізнэс-адміністраванне | 341 |
| БДУ | Лагістыка | 341 |
| БДУ | Менеджмент | 334 |

**Спецыяльнасці, на якія сёлета адсутнічаў конкурс, дзённая бюджэтная форма**

| ВНУ | Спецыяльнасць |
|---|---|
| БДУ | Беларуская філалогія |
| БДУ | Славянская (беларуская і славянская) філалогія |
| БДПУ імя Максіма Танка | Матэматыка. Інфарматыка |
| БДПУ імя Максіма Танка | Фізіка. Матэматыка |
| БДПУ імя Максіма Танка | Фізіка. Інфарматыка |
| БДПУ імя Максіма Танка | Фізіка. Тэхнічная творчасць |

**Найвышэйшыя прахадныя балы, дзённая платная форма, 2010**

| ВНУ | Спецыяльнасць | Балы |
|---|---|---|
| БДУ | Лінгвакраіназнаўства | 303 |
| БДУ | Міжнароднае права | 296 |
| БДУ | Міжнародныя адносіны | 283 |
| БДУ | Менеджмент (менеджмент у сферы міжнароднага турызму) | 264 |
| БДЭУ | Эканоміка | 255 |
| БДЭУ | Фінансы | 252 |
| БДЭУ | Эканоміка і кіраванне гатэлямі і рэстаранамі | 252 |
| БДЭУ | Камунікатыўныя тэхналогіі ў бізнэсе | 246 |
| БДЭУ | Эканоміка і кіраванне турыстычнай дзейнасцю | 243 |

## «Бандэрштат» ля беларускай мяжы

Пад Луцкам прайшоў фестываль Бандэры.

Гэты фестываль альтэрнатыўнай музыкі адбываўся 7—8 жніўня ў вёсцы Ракіні за 12 км ад Луцка на тэрыторыі Музея гісторыі сельскай гаспадаркі.

Сімвалам мерапрыемства быў нацыянальны герой Украіны Сцяпан Бандэра. Дух Украінскай паўстанцкай арміі (УПА) прасочваўся ў паказальных выступах баявога гапака, рэканструкцыі бою паўстанцаў з войскамі НКВД і агульным аздабленні.

Канцэрт адзначыўся забаронаю распіцця спіртных напояў. З раніцы ў нядзелю ўсіх жадаючых запрашалі ў капліцу на службу Божую.

Падчас сустрэчаў з ветэранамі УПА і палітыкамі зазначалася, што дзейсная ўкраінская ўлада не збіраецца шанаваць нацыянальных герояў. На майках сябраў арганізацыі «Нацыянальны Альянс» на пяці мовах, сярод якіх і беларуская, быў надпіс «Прабачце, што мой прэзідэнт — ідыёт. Я за яго не галасаваў!».

Ветэраны УПА заклікалі моладзь працаваць на карысць мясцовых выбараў, якія хутка адбудуцца ва Украіне, каб хоць на мясцовым узроўні абраць дэпутатаў, якія будуць рупіцца аб нацыянальных інтарэсах. Дарэчы, у арганізацыі фэсту дапамагала мясцовая ўлада.

Рукапашныя змаганні, сілавыя гульні, пейнтбол, палёты на дэльтаплане, кірмашы — усё гэта было неадʼемнаю часткаю фестывалю.

У першы дзень свята, нягледзячы на рокавы фармат мерапрыемства, на сцэне з'явіўся беларускі рэпер Vinsent, які быў адным з хэдлайнераў канцэрта. Якраз на час яго выступу сціхлі грымоты і дождж, што паліваў слухачоў увесь вечар.

Канцэрт ля беларускай мяжы наведалі паўтара дзесятка беларусаў: над натоўпам луналі бел-чырвона-белыя сцягі. Вінсэнту выступ на замежнай сцэне прынёс сяброўскія кантакты — гурт з Луцка «Фіолет» прапанаваў яму запісаць разам украінска-беларускую песню.

На наступны «Бандэрштат» аргкамітэт мерапрыемства плануе запрасіць N.R.M.

**Юльян Місюкевіч**

# «Супернік Лукашэнкі — паляк»

Пад такім загалоўкам з'явіўся артыкул пра Яраслава Раманчука ў «Жэчпаспалітай».

За пост прэзідэнта ў Беларусі будзе змагацца паляк па паходжанні, эканаміст Яраслаў Раманчук, піша газета. Аналагічныя артыкулы змясцілі іншыя польскія выданні.

Яраслаў Раманчук нарадзіўся ў Сапоцкіне Гродзенскага раёна і на малой радзіме мае рэпутацыю чалавека, які зрабіў ашаламляльную кар'еру, хоць ніколі не займаў высокіх дзяржаўных пасадаў, а яго даходы (каля $400 у месяц) параўнальныя з сярэднімі па краіне. У Сапоцкіне няма чалавека, які б не хваліўся, што «наш Ярык будзе змагацца з Лукашэнкам за пасаду прэзідэнта».

### З праграмай

У прэзідэнцкай кампаніі Раманчук выступае з праграмай «Мільён новых працоўных месцаў для Беларусі». Па словах Раманчука — прыхільніка свабоднага рынку, — рэформы, праведзеныя ім, за два гады могуць павялічыць сярэдні заробак у Беларусі да $600 (Аляксандр Лукашэнка абяцаў $500 да канца года).

У геапалітычных пытаннях Раманчук з'яўляецца прыхільнікам партнёрства з Расіяй, Украінай і ЕС. Адсутнасць антырасійскіх лозунгаў у яго праграме можа сведчыць пра неблагія шанцы гэтага кандыдата быць падтрыманым Крамлём. Такога кшталту спекуляцыі распаўсюдзіліся, калі Лябедзька і Раманчук сустрэліся ў Маскве з Анатолем Чубайсам і міністрам фінансаў Аляксеем Кудрыным.

### Ганарыцца каранямі

У выказваннях палітыкаў пра Раманчука і артыкулах журналістаў рэдка згадваецца яго нацыянальнасць. Між тым, ён ніколі не хаваў, што ён паляк. У адным з інтэрв'ю ён прызнаўся, што за савецкай уладай яго праз польскае паходжанне не прынялі ў вайсковае вучылішча. Раманчук адным з першых уступіў у 1989 у новы Саюз палякаў Беларусі (у той час — Аб'яднанне імя Элізы Ажэшкі). Пасля канфлікту Саюза палякаў з уладамі адназначна заняў бок непрызнанай уладамі арганізацыі. Дэкларуе прыхільнасць да каталіцызму.

**Алесь Пілецкі**

**«Не ацэньвайце палітыка па ягоным этнічным паходжанні»,**

— кажа Яраслаў Раманчук, кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Яраслаў Раманчук: Калі апазіцыі патрэбны новы твар на выбарах, мая кандыдатура падыходзіць ідэальна.

**— Нягледзячы на тое, што Вы паляк і сябра непрызнанага ўладамі Саюза палякаў Беларусі?**

— Тое, што я паляк, перашкаджае толькі зацятым нацыяналістам, але не нармальным людзям, беларусам, якія ацэньваюць палітыка па ягонай праграме, яго поглядах і ўчынках, а не па этнічным паходжанні. Маё сяброўства ў Саюзе палякаў Беларусі можа быць выкарыстанае супраць мяне з боку дзяржаўнай прапаганды. Пакуль, аднак, такога не было.



**Яраслаў Раманчук з лідэркай палякаў Анжалікай Борыс.**

# Ас загінуў на вачах у жонкі

74–гадовы нямецкі пілот згарэў з верталётам падчас спаборніцтваў пад Мінскам.

На адкрытым Кубку СНД па верталётным спорце, які праходзіў на аэрадроме Баравая пад Мінскам, разбіўся нямецкі экіпаж. Гэта адбылося 8 жніўня падчас паказальных выступленняў пры выкананні фігуры вышэйшага пілатажу «мёртвая пятля».

Гелікоптэр упаў і згарэў. Экіпаж загінуў.

74-гадовы Гюнтэр Цымер быў прызнаным асам у малой авіяцыі і адным з нямногіх пілотаў у свеце, што выконвалі на шрубалёце фігуру вышэйшага пілатажу «мёртвая пятля».

Здарэнне адбылося на вачах у жонкі пілота, якая, паводле інфармацыі журналістаў, прысутнічала на чэмпіянаце. Ягоная жонка Ірына таксама займаецца верталётным спортам. Дарэчы, яна беларуска, паходзіць з Віцебска. Пазнаёмілася з Цымерам на спаборніцтвах у Маскве, выйшла замуж і ўжо больш за восем гадоў жыве ў Германіі.

«Рабіць пятлю нескладана, калі нават я змог гэта зрабіць, але вельмі шмат што залежыць і ад верталёта», — сказаў нямецкі пілот Гюнтэр Цымер у інтэрв'ю беларускім тэлеканалам за некалькі гадзін да сваёй гібелі.

Эксперты не выключаюць і памылкі пілота: усё ж 74-гадовыя лётчыкі сустракаюцца нячаста.

**Мікола Бугай**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Субтрапічнае паветра яшчэ на тыдзень

запануе над Беларуссю.

Гэтае лета акажацца самым спякотным за ўсю гісторыю метэаназіранняў. Першая дэкада жніўня дала новы тэмпературны рэкорд — 38,9 градуса вышэй за нуль у Гомелі 8 жніўня.

Такім чынам, пабіты рэкорд, устаноўлены амаль 64 гады таму, — 38 градусаў 20 жніўня 1946 года ў Васілевічах (Гомельская вобласць).

Аднак рубяжу 40 градусаў слупок так і не дасягнуў. Хоць прагнозы абяцалі такую тэмпературу для Гомельшчыны. Аднак тое можа здарыцца ў наступныя выхадныя. У другой палове гэтага тыдня вятры з поўдня адцісну́ць атлантычны цыклон, і над Беларуссю каторы раз за гэтае лета запануе гарачае субтрапічнае паветра.

Ужо ў чацвер, 12 жніўня, тэмпература паветра ў дзённыя гадзіны складзе 26–32 градусы вышэй за нуль, у паўднёва-ўсходніх раёнах паветра прагрэецца да плюс 35–37 градусаў.

Тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад плюс 15 да плюс 24 градусаў, а днём у пятніцу 13 жніўня — ад 29 да 34 градусаў вышэй за нуль. На ўсходзе Беларусі чакаецца плюс 35–37 градусаў. Толькі месцамі субтрапічную парнасць асвяжаць кароткачасовыя навальнічныя дажджы.

У выхадныя дзённая тэмпература зноў дасягне рэкордна высокіх значэнняў — плюс 30–36 градусаў, па ўсходзе — да плюс 37–39 градусаў.

**МБ**

# Лясныя пажары ў Беларусі не дасягнуць расейскіх маштабаў

У Беларусі захаваная структура аховы лясоў, ганарацца ва ўрадзе.

Ад пачатку красавіка ў Беларусі зарэгістравана 420 лясных пажараў — але расійская сітуацыя не паўторыцца.

— Рэч у тым, што ў Беларусі застаюцца структуры аховы лясоў, ад якіх адмовіліся ў Расіі, дзе кантроль за пажарнай бяспекай адбываецца выбарачна, — пахваліліся нам у прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі. — У Беларусі ж такія структуры захаваліся. Ім таксама дапамагаюць экалагічныя службы і МУС. Таму нават сітуацыя высокай пажарнай небяспекі ў перыяд павышаных тэмператур застаецца пад кантролем.

Нагадаем, што лясныя пажары ў Расіі дагэтуль не ўзятыя пад кантроль канчаткова, а смог над Масквой паспеў накрыць увесь горад і пранік нават у метро. Абмежавана і дзейнасць маскоўскіх аэрапортаў — дым засцілае пасадачныя палосы.

На сёння ў Беларусі закрыты для наведвання лясы Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей. За парушэнне забароны давядзецца заплаціць штраф памерам да 25 базавых велічыняў.

У Віцебскай вобласці наведванне лясоў абмежавана каля Віцебска, Полацка, Лёзна, Суража і Дрэтуні. У Гродзенскай — каля Гродна і Скідаля. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях — амаль ва ўсіх раёнах.

Дастатковая сырасць захоўваецца ў лясах Мінскай і Брэсцкай абласцей. Тут забароны на наведванне лясоў пакуль не ўводзіліся. Людзі працягваюць збіраць чарніцы і падступаюцца да брусніц.

У перыяд забароны перакрываюцца ўсе шлагбаумы на дарогах у лес. Забараняецца выпальванне сухой травы ў лясах, на палях і лугах.

**ЮУ**



DRUGOI.LIVEJOURNAL.COM

Смог у Маскве.

# «Сам лёг на падлогу і склаў рукі за спінай»

Абрабаванне банка «Мінск—Масква» на вуліцы Лабанка, 22 скончылася няўдачай для злачынцы.

Ён схаваўся ў памяшканні банка і дачакаўся 17-й гадзіны, пакуль тры касіркі не закрылі аддзяленне, а пасля напаў на іх. Дзвюх касірак ён закрыў у банкаўскай прыбіральні, але ім удалося звязацца з дзяжурным пультам. Міліцыя прыбыла літаральна праз хвіліну, і рабаўнік, які зразумеў, што іншага выйсця ў яго няма, здаўся сам. Па словах аператыўнікаў, ён паклаў грошы назад у сейф, і сам лёг на падлогу, склаўшы рукі за спінай. Маску і пальчаткі ён зняў.

Няўдалая здабыча рабаўніка павінна была скласці 650 мільёнаў беларускіх рублёў, 37 тысяч даляраў, 29 тысяч еўра і 750 тысяч расійскіх рублёў.

Пра самога злачынцу вядома, што ён беспрацоўны і несудзімы, пражываў недалёка ад банка і выбраў менавіта гэты банк, бо ў ім адсутнічае сістэма відэаназірання. На сябе ён апрануў джынсы і кашулю, а пад іх майку і шорты — калі б яго план здзейсніўся, апазнаць яго на вуліцы было б немагчыма.

Супрацоўнікі банка адмаўляюцца каментаваць здарэнне. Адна з касірак цяжарная, і пасля перанесенага шоку была адпраўлена ў радзільню. Як паведаміў нам кіраўнік групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента аховы МУС Аляксандр Герасімаў, у Беларусі праверана на прадмет сістэмы аховы 790 пунктаў абмену валюты, праверку прайшлі ўсе — працы ніводнага пункта не прыпынена. Але ў 30 працэнтах з іх адсутнічае відэаназіранне, 21 працэнт не здаецца на ахову падчас перапынкаў, а ў 20 працэнтах няма «трывожных» кнопак. Таксама трэба зазначыць, што такі выпадак для Беларусі — рэдкасць. Часцей за ўсё рабуюць банкаматы, а летась быў усплёск абрабаванняў абменных пунктаў.

**Юрась Ускоў**

## Здарэнні сцісла

• **Раскрылі забойства 14-гадовай даўніны.** 52-гадовы барысавец, які ў 1996 забіў чалавека, з'явіўся ў міліцыю з пакаяннем. Ён прызнаўся, што на п'яную галаву пасварыўся з сустрэчным і ўдарыў таго нажом у сэрца. У той жа дзень тым самым нажом параніў яшчэ аднаго выпадковага знаёмага, з якім выпіваў у кампаніі. 14 гадоў мужчына жыў у Барысаве пад выдуманым імем. Падчас дактыласкапіі насельніцтва (у сувязі з расследаваннем выбуху ў Мінску) у яго таксама ўзялі адбіткі пальцаў, таму мужчына палічыў, што яго абавязкова знойдуць. Суд даў яму 13 гадоў турмы.

• **Помста за аборт?** А другой гадзіне ночы 5 жніўня 22-гадовы хлопец залез у хату 37-гадовай жыхаркі вёскі Гавяды Шклоўскага раёна. Ён ударыў жанчыну нажом у грудзі — жанчына ад таго памерла. Пасля ён літаральна скрамсаў 17-гадовую дачку гаспадыні. На шум з іншага пакоя выскачыў 39-гадовы бацька. І на яго напаў злачынец. Толькі 12-гадовы сын гаспадароў не пацярпеў. З ім цяпер працуюць псіхолагі. Злачынец абвешчаны ў вышук. Вядома, што ён сябраваў з забітай ім дзяўчынай. Выказваецца здагадка, што ён помсціў дзяўчыне за тое, што яна зрабіла аборт. Асаблівыя прыкметы падазронага: на левай руцэ ад локця да кісці шнар ад парэзу, на правай руцэ ў раёне запясця таксама шнар, на правым плячы тату ў выглядзе змяі.



Фота падазраванага.

• **Беларусы замяшаныя ў міжнародны скандал з гандлем чалавечымі органамі.** Украінскія праваахоўнікі спынілі дзейнасць транснацыянальнай групоўкі «чорных трансплантолагаў». У яе працы бралі ўдзел украінскія хірургі з Нацыянальнага інстытута хірургіі і трансплантологіі. Злачынная групоўка дзейнічала каля трох гадоў. Грамадзян Украіны, Расіі, Малдовы, Беларусі і Узбекістана перавозілі ў Азербайджан і Эквадор, каб перасадзіць іх органы рэцыпіентам з Ізраіля. Донарамі былі каля 50 чалавек. Набор донараў ішоў праз абвесткі ў інтэрнэце. Большасць з іх — здаровыя жанчыны ад 18 да 25 гадоў. Кожны донар атрымліваў за продаж ныркі 10 тысяч долараў.

• **У Мінску кіроўца без правоў наехаў на дзіця.** 31-гадовы мужчына, кіруючы аўтамабілем «Нісан Тэрана», збіў 10-гадовага хлопчыка, які пераходзіў дарогу на зялёны сігнал. Пешаход атрымаў чэрапна-мазгавую траўму сярэдняй ступені.

**СМ**

# Дзень п’янага дэсантніка, або Чаго баіцца міліцыя

Піша **Сямён Печанко**.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Уявіце наступную карціну: 1 жніўня беларускія чыгуначнікі адзначаюць сваё прафесійнае свята. Натоўпы мужыкоў у спецформе з надпісам «Беларуская чыгунка» п’юць гарэлку ў парках і купаюцца ў фантанах пад абыякавыя позіркі мінскага спецназа. Вам таксама стала смешна?

Нясмешна робіцца 2 жніўня, калі прыходзіць Дзень дэсантніка і на вуліцы нашых гарадоў выходзяць людзі ў цяльняшках (а яшчэ ёсць і 28 мая — Дзень памежніка). Акурат купанне ў фантанах у нецвярозым стане і ёсць адным з галоўных атрыбутаў святкаванняў у былых вайскоўцаў элітных частак. Нярэдка ўспыхваюць канфлікты — як паміж сабой, так і з простымі грамадзянамі. Апошнія ў такія дні церпяць: натоўп нецвярозых і часта агрэсіўных мужыкоў, што мацюкаюцца і шукаюць прыгодаў, уяўляе сабой рэальную небяспеку.

На форуме Гродзенскага блога s13 адзін з чытачоў звяртае ўвагу, што на іншыя гарадскія святы ў горадзе паўсюдна ставяцца турнікеты і забараняецца продаж алкаголю, чаго не скажаш пра Дзень дэсантніка. «Гэта што — бяскрыўднае дзіцячае свята?» — задае ён рытарычнае пытанне.

Распіццё алкаголю ў грамадскіх месцах, роўна як і знаходжанне на людзях у нецвярозым стане, лаянка і рукапрыкладства — усё гэта адміністрацыйныя, а то і крымінальныя правапарушэнні. І тут самы час пагаварыць пра ролю міліцыі, чый наўпросты абавязак папярэджваць гэтыя негатыўныя з’явы ў грамадстве. А яна фактычна на ўсё заплюшчвае вочы.

Пра сёлетняе 2 жніўня мінская міліцыя адрапартавала так — святкаванне, у якім прынялі ўдзел больш за тысячу чалавек, абышлося без сур’ёзных інцыдэнтаў і грубых парушэнняў грамадскага парадку з боку былых дэсантнікаў. Вось так. Купанне ў нецвярозым стане ў фантане ды прагулкі па праезнай частцы — гэта несур’ёзна?

Чаму міліцыя не чапае п’яных гарлапанаў у берэтах і цяльняшках? Мо баіцца? Мы ж памятаем пра пазалеташні, ці не адзіны гучны інцыдэнт на Востраве слёз, калі спецназ счапіўся з былымі дэсантнікамі. Можа, нежаданне чапаць нецвярозых малойцаў, каб не правакаваць падобныя сутычкі, і ёсць галоўнай прычынай пасіўнасці міліцыі?

Не забываем і пра культ грубай сілы, папулярны ў несвабодных грамадствах.

# Яна згарэла

Пра пажары ў Расіі піша **Віталь Тарас**.



Шмат гадоў таму давялося адпачываць у вёсцы Бабінічы пад Оршай. Лета было амаль такое гарачае, як цяпер. З жонкай, сынам і цешчай пайшлі ў бліжэйшы лес у ягады. І раптам убачылі — у сасновым бары проста перад намі загарэўся мох.

Мы кінуліся тушыць агонь, проста топчучы яго. Потым нехта збегаў за рыдлёўкамі і мы сталі закідваць полымя зямлёй. Удалося спыніць пажар, патраціўшы на гэта нямала сіл і часу. Нам дапамагалі яшчэ пара чалавек, якія выпадкова апынуліся з намі ў лесе. Але што запомнілася найбольш — з вёскі, якая была побач, праз роў, не прыйшоў на дапамогу ніхто, хоць людзей там жыло шмат.

Той эпізод успомніўся мне на фоне паведамленняў пра пажары ў Расіі. Паводле звестак НАСА, з комасу на яе тэрыторыі зафіксавана каля 600 ачагоў.

### Лета, як армагедон

Нечакана высветлілася, што ў магутнага расійскага МНС бракуе тэхнікі і пажарных. Бракуе вады, каб гасіць пажары. А ў абсалютнай большасці вёсак няма нават супрацьпажарных ускапаных палосаў вакол іх.

Як выявілася, узаранай зямлі, якая служыць натуральнай перашкодай на шляху полымя, вельмі мала ў цэнтральнай Расіі. Вялікія плошчы, парослыя хмызнякам ды пустазеллем, заваленыя смеццем, выгараюць імгненна.

**Галоўны прынцып сістэмы — той, хто на вяршыні, ніколі і ні за што не адказвае.**

Паводле апошніх звестак, загінулі паўсотні чалавек. Тлумачэнне даецца вельмі простае: прыродная анамалія. За апошнія 150 гадоў метэаназіранняў не было падобнай паводле працягласці спёкі. Жыхары Беларусі, якія сёлета таксама сталі ахвярамі нечуванай гарачыні, могуць толькі паспачуваць сваім суседзям. Дарэчы, і ўкраінцам.

Аднак, у Расіі, як вядома, нават прыродныя з’явы адразу набываюць палітычнае ці нават, можна сказаць, — эсхаталагічнае значэнне. Патрыярх РПЦ Кірыла падчас паездкі ў Ніжагародскую вобласць назваў пажары «Божай карай». На пачатку гэтага года, калі землятрус на Гаіці забраў жыцці амаль 1,5 мільёна чалавек, патрыярх назваў тую катастрофу таксама пакараннем за грахі. Але Расія ўсё ж, адрозна ад Гаіці, — не самая бедная краіна свету. І калі ад моцных землятрусаў уратавацца амаль немагчыма, дык ад наступстваў пажараў усё ж засцерагчыся можна. Для гэтага трэба, не спадзеючыся толькі на Бога, хаця б выкапаць канаву.

### Курская анамалія

Вядома, усё павінна вырашацца не «ўнізе», з дапамогай мясцовага самакіравання, але на самым «версе». Вышэйшае кіраўніцтва ўводзіць у пэўных рэгіёнах рэжым надзвычайнай сітуацыі, загадвае забяспечыць належныя захады, праводзіць нарады з удзелам кіраўнікоў рэгіёнаў і ведамстваў, нарэшце — выязджае ў пацярпелыя раёны, дзе ажыццяўляе «кіраўніцтва на месцах». Правядзенне гэтых мерапрыемстваў не перашкаджае пайсці ў перапынку паміж імі на футбольны матч, як гэта зрабіў прэзідэнт Расіі.

Кіруе вышэйшае начальства, сярэдняе звяно — губернатары — служаць яго «прывадным рэменем», адказнасць жа нясуць тыя, хто стаіць у самым нізе — напрыклад, у выпадку патрэбы, можа падаць у адстаўку які-небудзь кіраўнік мясцовай адміністрацыі.

Гэтую сістэму «вертыкалі» пераняў у Аляксандра Лукашэнкі на самым пачатку свайго прэзідэнцтва цяперашні прэм’ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін. Адзін з галоўных прынцыпаў сістэмы: той, хто на вяршыні, ніколі і ні за што не адказвае перад людзьмі.

У гэтым месяцы ў Расіі будуць адзначаць дзясятую гадавіну гібелі падводнай лодкі «Курск». Сёння ёсць падставы ўспомніць не толькі абставіны трагедыі ў Баранцавым моры, акалічнасці смерці 118 членаў экіпажа. (На жаль, не дапамагла падараваная экіпажу копія іконы Курскай Божай Маці.) І не толькі паводзіны кіраўніцтва марфлота, якое да апошняга ўтойвала падрабязнасці ад жонак маракоў і грамадскасці. Вельмі часта згадваюць і словы прэзідэнта Пуціна, прамоўленыя ў праграме амерыканскага журналіста Лары Кінга на CNN. На пытанне — што ўсё-такі здарылася з падлодкай? — Уладзімір Пуцін адказаў: «Яна патанула». Была восень 2000 года.

**Пажары выявілі: узаранай зямлі, натуральнай перашкоды для полымя, амаль не засталося ў цэнтральнай Расіі.**

Калі б у прэм’ер-міністра, які, выглядае, пачаў ужо кампанію прэзідэнцкіх выбараў-2012, запыталіся сёння — што адбываецца з Расіяй? — ён мог бы гэтак сама спакойна адказаць: «Яна згарэла».

### Калі развеецца дым

Справа не толькі ў «вертыкалі», якой няма справы да людзей. Справа ў саміх людзях, якім няма справы да чужой бяды. Тэхналагічныя катастрофы, тэракты ў метро, «контртэрарыстычныя аперацыі» на Каўказе... Да ўсяго гэтага расійскае грамадства даўно прызвычаілася.

У курадыме сёлетніх пажараў развейваюцца апошнія ілюзіі. Сярод іх — надзея некаторых беларускіх палітыкаў на тое, што фільмы кшталту серыяла НТВ пра «хроснага бацьку» паўздзейнічаюць на расійскую тэлеаўдыторыю. Усё, у чым абвінавачваюць Лукашэнку стваральнікі тых фільмаў, расійскі глядач неадноўчы назіраў у сваёй айчыне. Знайшлі чым яго напалохаць...

Сёння зноў, як дзевяноста гадоў таму, Расія ў імгле. А Беларусь? Пакуль яна розніцца ад яе ніжэйшай, у сярэднім, тэмпературай паветра. І тое нябагата.

*Артыкулы на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.*

# Рада інтэлігенцыі з удзелам генерала вызначыла нам лідэраў

Гэта было б смешна, калі б не выглядала так цынічна.
Піша **Андрэй Дынько**.

Рада інтэлігенцыі вызначыла спіс прэтэндэнтаў на званне адзінага. У ім ёсць Калякін — які хіба і кандыдатуры не вылучаў, бо цвяроза ацэньвае шанцы на сваё абранне лідэрам апазіцыі. Але ў ім няма Мілінкевіча. «Не ўвайшлі ў пяцёрку абраных той жа Аляксандр Ярашук, Аляксандр Мілінкевіч, але галасаванне было сумленным, аб’ектыўным, незаангажаваным», — растлумачыў дырэктар Колас. А сябар Рады інтэлігенцыі патлумачыў у каментарах на сайце «НН»: за Някляева прагаласавалі ўсе прысутныя, а за Мілінкевіча не было ніводнага голасу. Карацей, няма, бо не пасуе.

Ну так: Калякін, які прапаноўваў Абхазію прызнаць і ўвядзенне адзінай валюты з Расіяй узважваў, дадзеным сцэнарыстам, рэжысёрам і касцюмерам пасуе. А Мілінкевіч — не.

І плявацт на сацыёлагаў, якія даюць Мілінкевічу найбольшы рэйтынг. Ці ж павінна інтэлігенцыя аглядвацца на народ ці тым больш на буржуазную навуку сацыялогію? Місія інтэлігенцыі — у тым, каб народ, і сацыёлагаў у тым ліку, весці наперад.

Вы там што, бля, а? Смір-рна! — скамандаваў нам генерал*. Ён прыкацціў на нашы povinnasci з мітынгу за яднанне народаў Беларусі і Расіі. Па цотных днях ён кандыдат у прэзідэнты проста, а па няцотных — відны дзеяч Рады інтэлігенцыі, якая вызначае кандыдата ў прэзідэнты не проста...

Можна па-рознаму ацэньваць Мілінкевіча і ягоную палітычную стратэгію. Але той факт, што ў сённяшніх умовах чалавек мае свой рэйтынг, пра нешта гаворыць. Прынамсі, пра сувязь ягоных праграмы і стылю паводзінаў з чаканнямі часткі грамадства.

Можна па-рознаму ацэньваць і Някляева, і ягоны палітычны патэнцыял — стратэгіі тут пакуль няма, зарана ўжываць гэтае слова. Але стыль і адрасат ягонай палітычнай аргументацыі таксама пра нешта гавораць: «Некалі Беларусь абавязкова ўступіць у Еўрасаюз. І як гэта сёння ні здасца некаму дзіўным — з дапамогай Расіі, якая знойдзе ў тым сваю выгаду», — заявіў ён у мінулым нумары «НН». Я разумею, які разлік стаіць за такімі заявамі, але, прабачце, многія маюць іншы ідэал Беларусі.

Пра якога «адзінага кандыдата» можа ісці гаворка ў такой сітуацыі? У дадзеным выпадку аўтарытэтам інтэлігенцыі прыкрываюць камбінацыі ва ўнутрыапазіцыйным змаганні за ўплыў. Нельга так злоўжываць даверам выдатных дзеячаў культуры.

Я бачу фундаментальную памылку ў тым, што многія на пустым месцы ўявілі сябе «публічнымі палітыкамі», хоць ніякай «публічнай палітыкай» пры гэтым рэжыме і не пахне. Механіка палітычнага іншая ў сённяшняй Беларусі. І гэта сучаснае: у прынцыпе, хохмы кшталту рашэння Рады інтэлігенцыі — гэта праблема, выкліканая заганным механізмам, а не заганнай мараллю.

*Як напісаў у №17 «НН» старшыня Рады інтэлігенцыі Уладзімір Колас, генерал Фралоў таксама ўваходзіць у Раду.

# «Вярну ім свае ўзнагароды»

**89-гадовы вязень ГУЛАГа дайшоў да Вярхоўнага суда, дабіваючыся кампенсацыі за незаконныя рэпрэсіі.**

Сталыя чытачы «Нашай Нівы» знаёмыя з Аляксандрам Доўбікам з Карэліцкага раёна па артыкуле «Дзесяць гадоў лагера за лісты да Джавахарлала Нэру» (№40 ад 1 лістапада 2007). У 1958 г. Аляксандра Сафронавіча арыштавалі за ананімныя лісты да прэзідэнта ЗША Эйзенхаўэра, прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Ідэна ды прэм'ера Індыі Нэру. У іх ён пісаў пра парушэнне правоў чалавека ў СССР, масавыя рэпрэсіі і аднаўленне прыгону ў вёсцы. Настаўнік з Карэліччыны прасіў сусветных лідэраў паўплываць на Мікіту Хрушчова, каб той урэшце пачаў паважаць правы савецкіх працоўных. Суд расцаніў лісты да сусветных лідэраў як «паклёп на КПСС, савецкі ўрад, яго ўнутраную ды знешнюю палітыку, а таксама ўмовы жыцця працоўных». Вырак — 10 гадоў катаргі і 5 гадоў пазбаўлення ў правах. Акрамя таго, Доўбіка, удзельніка вайны, пазбавілі вайсковых ўзнагародаў. У снежні 1991 г. Аляксандра Сафронавіча рэабілітавалі.

## «Хачу жыць побач з роднымі»

У незалежнай Беларусі былы настаўнік таксама піша лісты. Колькі гадоў таму прасіў Філарэта паспрыяць пабудове капліцы ў Курапатах, да былога міністра МУС Навумава звяртаўся наконт курапацкіх вандалаў.

Цяпер 89-гадовы ветэран дасылае лісты ў суды. Ён хоча атрымаць кампенсацыю за незаконны арышт і катаргу. Рыхтуючыся да суда, Аляксандр Сафронавіч звярнуўся з запытам у Канстытуцыйны суд. Адтуль атрымаў адказ, што парадак кампенсацыі шкоды, нанесенай у выніку незаконнага арышту, вызначаецца артыкулам 460 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса (глава 48). Згодна яго, шкода, нанесеная ў выніку незаконнага затрымання, утрымання пад вартай, асуджэння, прымянення прымусовых мераў бяспекі і лячэння, кампенсуецца дзяржавай у поўным аб'ёме. Акрамя гэтага, Доўбік апелюе да артыкула 969 Грамадзянскага кодэкса, які гарантуе матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды, а таксама міжнародных пагадненняў, якія рэгулююць парадак кампенсацыі незаконна асуджаным. У прыватнасці, да Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх правах, падпісанага нашай краінай.

«На маім баку канстытуцыя і міжнародныя пагадненні, таму я маю права на кампенсацыю за незаконны прысуд», — упэўнены вязень ГУЛАГа. Грошы, калі іх удасца атрымаць, ён хоча патраціць на кватэру ў Мінску. «Хачу жыць побач з роднымі, каб яны мяне пахавалі. Каб над маёй магілай расказвалі сваім дзецям пра мяне і нашу пакутніцкую сям'ю».

Спадар Доўбік ад 2003 г. жыве ў інтэрнаце для састарэлых у в.Жухавічы Карэліцкага раёна.

## «Бюджэт не прадугледжваў кампенсацыі за рэпрэсіі»

У снежні 2009 г. у Карэлічах адбыўся першы суд. Яму папярэднічалі шматлікія беспаспяховыя спробы Доўбіка высветліць, ад каго патрабаваць кампенсацыю. Дапамог зварот у Міністэрства юстыцыі і да юрыстаў. У судзе Аляксандр Сафронавіч запатрабаваў ад фінаддзела Карэліцкага райвыканкама 200 мільёнаў рублёў. Ён прадставіў суду неабходныя дакументы, якія пацвярджалі факт ягонага арышту і рэабілітацыі, і ліст з Канстытуцыйнага суда.

Прадстаўніца райвыканкама прыйшла на суд з пустымі рукамі. Яна адзначыла, што ў раённым бюджэце на 2009 г. не былі закладзеныя сродкі на выплату кампенсацый за незаконныя рэпрэсіі.

Пасля кароткага перапынку суддзя коратка абвясціла, што пазоў Доўбіка адхілены.

Потым былі звароты ў Гродзенскі абласны суд, дзе некалі былому настаўніку далі 10 год, у Вярхоўны суд. Але плёну яны не прынеслі. Доўбіку заявілі, што парадак аднаўлення правоў пацярпелых ад рэпрэсій рэгулюецца Палажэннем, зацверджаным пастановай Вярхоўнага Савета ад 21 снежня 1990 г. Палажэнне гэта не прадугледжвае кампенсацыі маральнай шкоды. З адказу з Вярхоўнага суда таксама вынікае, што спасылкі на сучасныя Грамадзянскі і Крымінальна-працэсуальны кодэксы не могуць разглядацца, бо дзейснае заканадаўства не прадугледжвае распаўсюджання гэтых нормаў на рэпрэсіі 20—80-х гадоў XX ст.

## «Не паслухае Сукала — напішу Макею»

У свае гады Аляксандр Сафронавіч выглядае бадзёра. Хоць і скардзіцца час ад часу на зрок і слых, а таксама памяць. У ягонай палаце на стале ляжаць стосы газет і кніжак. На стале — мемуары пад назвай «Мой радавод. Лёс сям'і ў XX стагоддзі». Ён далёка не адзіны ў радзіне, хто пацярпеў ад сталінскіх рэпрэсій. Дзеда і бацьку расстралялі. Месца пахавання апошняга ён не ведае дагэтуль. Маці, цётка і бабуля прайшлі праз лагеры. Усіх іх пазней рэабілітавалі. А прадзеда Доўбіка саслалі ў Сібір яшчэ за царом за падтрымку паўстанцаў-каліноўцаў. Праца над успамінамі — гэта намаганне данесці праўду пра знішчаных ні за што людзей, ягоных крэўных.

Аляксандр Доўбік не бачыць вялікай розніцы паміж уладай бальшавікоў, што скалечыла яго маладосць, і цяперашняй лукашэнкаўскай, якая ўсяляк дэманструе пераемнасць з савецкай, але пры гэтым адмаўляецца плаціць за яе грахі. І ўсё ж ён збіраецца ісці да канца, каб давесці, што любая крыўда, хай бы і нанесеная дзясяткі год таму, мае сваю цану. Цяпер ягоную скаргу мае разгледзець старшыня Вярхоўнага суда Валянцін Сукала. «Калі і ён адмовіць — напішу Макею ў Адміністрацыю прэзідэнта, — кажа Доўбік. — А не паслухаюць там, то збяру ўсе свае ўзнагароды, віншаванні ад уладаў ды адашлю заказной поштай на Карла Маркса, 38».

**Сямён Печанко**


СЯМЁН ПЕЧАНКО

**89-гадовы ветэран дабіваецца кампенсацыі за зламанае жыццё. Справа: Такім быў Аляксандр Доўбік у маладосці.**

### Максімум — 60 «мінімалак»

У пачатку 90-х мінулага стагоддзя ў краінах былога СССР былі распрацаваныя нарматыўныя акты, якія рэгулявалі парадак атрымання вязнямі ГУЛАГа грашовых кампенсацый.

21 снежня 1990 Вярхоўны Савет Беларусі зацвердзіў Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзянаў, пацярпелых ад рэпрэсій 1920–1950 гг. Яно прадугледжвае аднаразовую грашовую кампенсацыю з разліку паловы мінімальнага памеру заработнай платы за кожны месяц пазбаўлення волі, але не больш за 60 мінімальных памераў заработнай платы, усталяванай на момант разгляду заявы грамадзяніна ў адпаведных органах, са сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Мінімалка цяпер складае 258 600 рублёў.

7 лістапада 1994 Канстытуцыйны суд прыняў рашэнне «Аб удасканаленні заканадаўства, што рэгулюе кампенсацыю шкоды, нанесенай грамадзянам неправамернымі дзеяннямі». У ім утрымлівалася прапанова Вярхоўнаму Савету вызначыць у нацыянальным заканадаўстве парадак кампенсацыі шкоды, нанесенай грамадзянам незаконнымі дзеяннямі праваахоўных органаў пракуратуры і судоў. На сёння гэты парадак вызначаны падраздзелам 48 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса. Згодна яго, шкода, нанесеная незаконнымі рэпрэсіямі, кампенсуецца дзяржавай у поўным аб'ёме.

### Расія

У Расіі вязні палітычных рэпрэсій атрымліваюць кампенсацыю з разліку тры чвэрці ўсталяванага законам мінімальнага памеру зарплаты за кожны месяц пазбаўлення волі, але не больш за 100 мінімальных заробкаў (1 МЗП у Расіі складае 102 еўра).

### Украіна

Украінскі вязень ГУЛАГа можа разлічваць на кампенсацыю ў памеры 1 МЗП за месяц, праведзены ў месцах зняволення, але не больш за 75 «мінімалак». На сёння мінімальны заробак ва Украіне складае 75 еўра.

## Сярэдняя зарплата ў чэрвені 2010




**Звесткі пра сярэдні заробак — за чэрвень. Курс нацыянальных валют да даляра ўзяты па стане на 9 жніўня.**

## Сцісла

• **Ва Украіне павялічваюць пенсійны ўзрост жанчын.** Паступова ён будзе ўзняты да ўзроўню мужчын — з 55 да 60 гадоў. Па 6 месяцаў будуць дадаваць штогод, пачынаючы з 2010-га. Такі крок быў умовай для атрымання неабходнага для краіны крэдыту Міжнароднага валютнага фонду. Перад прэзідэнцкімі выбарамі Віктар Януковіч заяўляў, што ён супраць павелічэння пенсійнага ўзросту. «Парламент на гэта ніколі не пойдзе, мы гэта ніколі нікому не дазволім», — падкрэсліваў ён. Расце пенсійны ўзрост і ў многіх краінах Еўропы: да гэтага змушае старэнне насельніцтва ў выніку росту працягласці жыцця.

• **Беларус прыстасаваў Google Chrome да беларускай мовы.** Праверка беларускага правапісу ў гэтым браўзеры цяпер не праблема. У распрацоўцы праграміст Аляксей Сакалоў абапіраўся на слоўнікі, што выкарыстоўваюцца ў браўзеры Mozilla Firefox. Сакалоў працуе сістэмным адміністратарам. Дадатак да браўзера рабіў па ўласнай ініцыятыве. Раней Аляксей дапамагаў у перакладзе інтэрфэйса сэрвісаў Google на беларускую мову. Ён бярэ таксама ўдзел у стандартызацыі беларускай кампутарнай тэрміналогіі і з'яўляецца галоўным распрацоўшчыкам беларускай аперацыйнай сістэмы TrueBSD, развіццё якой у апошні час троху прыпынена. Для браўзера Google Chrome спампаваць слоўнік з класічным правапісам можна на сайце truebsd.org.

**Юльян Місюкевіч**

# А вада там блакітная

Крэйдавыя кар'еры на Ваўкавышчыне — адно з самых незвычайных месцаў у краіне.



### Якія кар'еры выбраць?

Пра існаванне крэйдавых кар'ераў даведаўся некалькі гадоў таму, але магчымасці пабачыць усё ніяк не было. На адны жнівеньскія выходныя вырашылі адкласці ўсе справы, каб паглядзець на гэты цуд.

Варта адзначыць, што падобных кар'ераў у Беларусі некалькі. Адны ў Любанскім раёне, другія — у Гродзенскім, трэція — у Ваўкавыскім. Пастанавілі ехаць на апошнія. Дарога да іх з Мінска хоць і няблізкая, але і дарогай ёсць што паглядзець.

Ехаць з Мінска досыць проста — па брэсцкай шашы да павароту на Слонім, а там амаль да самага Ваўкавыска. Агулам каля 250 кіламетраў у адзін бок выходзіць.

### Кавярня са Сталіным

Пасля больш як двухгадзіннага знаходжання за рулём у Слоніме можна спыніцца на адпачынак. Балазе, горад досыць душэўны.

Старыя камяніцы раўнамерна раскіданыя па цэнтры места. З клумбаў нясмела пазіраюць саматробныя маленькія слонікі. Ленін на цэнтральнай алеі ў адной руцэ трымае кепку, а іншай паказвае дарогу да Спаса-Праабражэнскага сабора. А ля закінутай сінагогі — адной з візітак горада — раскінуўся кірмаш.

У Слоніме вырашылі паабедаць. Першая кавярня, што знайшлася ў цэнтры, мела назву «Пятачок». Але назву сваю яна атрымала не ў гонар мілага персанажа казкі Алана Мілна.

«Пятачок» — гэта своеасаблівы запаведнік для тых, хто настальгуе па савецкай уладзе. Прычым, не па застойнай брэжнеўскай, а яшчэ ранейшай.

Сцены кавярні завешаныя савецкімі паштоўкамі з выявай Сталіна, дзе гаварылася, што кадры вырашаюць усё, выразкамі з газет, замест люстры вісіць барана. Высока пад столлю, побач з савецкімі сцягамі, размешчаныя галава дзіка і баян.

Меню ў «Пятачку», дарэчы, не вельмі багатае, але кормяць смачна і танна. Асабліва ім удаюцца бліны.

### Зэльвенскі эдэм

Па дарозе да Зэльвы як не заехаць у Сынкавічы, каб падзівіцца на абарончую царкву Святога Міхаіла Арханёла.

Гатычная царква, пабудаваная ў XV стагоддзі, мала змянілася з тых часоў. Стаіць наўзбоч ад вёскі, побач з маляўнічымі жытнёвымі палямі. Праўда, фермерскі комплекс непадалёк — ад таго і пахі ля царквы не самыя лепшыя.

Царква мае вежы з байніцамі, праз якія можна было страляць, а таксама назіраць за ворагам. У свой час цэрквы выконвалі не толькі абрадавыя функцыі. Унутры ж храма някк зусім просценька, а то нават і не дагледжана. Але турыстаў да бажніцы едзе багата.

Побач з царквой паставілі званіцу з «цыбулінай». Выглядае досыць недарэчна.

У Зэльве адразу кідаецца ў вочы высозны касцёл Найсвяцейшай Тройцы. Ён не такі і стары — яму няма і сотні гадоў. За саветамі выконваў функцыі крамы, а вернікам яго вярнулі ў 1989 годзе.

Бачна, што ксёндз сочыць не толькі за будынкам храма, але і за падворкам, які шчыльна засаджаны самымі рознымі экзатычнымі і не вельмі раслінамі. Такое даводзілася бачыць у іншых парафіях, да размаху Гервятаў ці Мосара, канечне, не дастае, але ўсё ўтульна і дагледжана. Нават невялічкі фантан са статуяй Маці Божай ёсць. Такі сабе эдэмскі сад пасярод Зэльвы.

Уваход на царкоўны падворак зачынены. Бюст Ларысы Геніюш змаглі пабачыць толькі праз плот. І дом паэткі насупраць (вул. Савецкая, 7). Праўда, сённяшняя гаспадары не вельмі ахвотна пускаюць на падворак.

Па дарозе з Зэльвы можна завярнуць у Ружаны, каб паглядзець на тамтэйшы палац. Але ў нас часу не так шмат, таму ўздоўж сланечнікавых і кукурузных палёў працягваем дарогу ў бок Ваўкавыска.



### «Там афігенна!»

Зрэшты, як потым высвятляецца, даязджаць да самага Ваўкавыска не абавязкова. Перад горадам ёсць указальнік на Краснасельскі, трэба паварочваць на яго.

Гэтая вёсачка вядомая на ўсю краіну заводам будаўнічых матэрыялаў, які вырабляе цэмент, і сустракае яна абсалютна жорсткімі індустрыяльнымі пейзажамі. Пасярод дарогі паўстае вялізная заводская спаруда.

З транспарту, што там перасоўваецца, найчасцей можна пабачыць здаравенныя БелАЗы, што курсуюць ад завода да кар'ераў. Будзьце пільнымі і асцярожнымі з гэтымі жодзінскімі цяжкавікамі, пад адзін такі ледзь не трапіў наш сціплы «Фольксваген».

Адразу на месцы цяжка зарыентавацца, куды ж рухацца далей. Забыліся зрабіць раздрукоўкі мясцовасці, таму пытаемся ў тутэйшых. Яны ўказваюць самы бліжэйшы шлях да кар'ераў.

Слонім—Сынкавічы—Зэльва—Краснасельскі—Ваўкавыск.

Уся ндоўгая дарога абсалютна белая. Белыя дрэвы, белыя закінутыя дамы. Першая думка: як тут жывуць людзі? Ці не пакутуюць ад лёгачных захворванняў? Стаяць закінутыя сельгаспабудовы. Краявіды, як у кампутарнай гульні «Сталкер».

Да крэйдавага кар'ера ад завода недалёка. Але нас там сустракае шлагбаум. Хлопцы на «Альфа-Рамэа», якая прыехала на хвіліну раней за нас, кажуць, што ён адчынены.

Са старожкі з'яўляецца дзядзькааховнік, які строга пытаецца, куды мы едзем. Нібыта тут ёсць іншыя варыянты. Спачатку ён напускае на сябе грозны выгляд, прапануе кіравацца ў іншае месца, але праз хвіліну лагаднее і дазваляе праехаць. Праўда, ставіць адну ўмову: «Не лазіць на кран». Даўно заржавелы пад'ёмнік стаіць як сімвал мінулага бурнага жыцця гэтага ўчастка зямлі.

А яшчэ дзе-нідзе трапляюцца дарожныя знакі «Стоп» ці «Расклад руху». Пад нагамі ўжо суцэльная крэйда, абутак імгненна робіцца белым. Машыны пакідаем недалёка ад выезду, а самі ідзём па зарослым травой асфальце ў пошуку кар'ераў.

Тыя самыя хлопцы з «Альфа-Рамэа» ўжо пабачылі гэты цуд. З задаволенымі тварамі яны вяртаюцца да машыны, каб рушыць далей.

«Ну як?» — пытаемся мы. «Там афігенна. Больш нічога не скажаш», — захоплена кажуць яны.

Нарэшце забіраемся на высокае месца і разумееш, што хлопцы не зманілі, — там сапраўды афігенна!

### Крэйда на зубах

Колькі да гэтага ні глядзеў на фотаздымкі кар'ераў у інтэрнэце, а да ўбачанага ўсё адно не гатовы. Краявіды агаломшваюць. Не верыш вачам, але тут ужо не скажаш, што перад табой фоташоп. Крутыя і глыбокія абрывы, нібы зменшаная версія амерыканскіх каньёнаў, а ўнізе блакітная-блакітная (як нехта яе пафарбаваў) вада!

Белае крэйдавае дно (там амаль няма расліннасці) у спалучэнні з вапнай дае такі незвычайны эфект. Стаіш колькі хвілін нерухома і проста атрымліваеш асалоду ад незвычайнага краявіду.

Кар'ер доўгі, дзесьці з кіламетр. Месцаў, дзе можна падабрацца да вады, зусім нямнога. Зрэшты, і купацца рызыкне не кожны. Глыбіня месцамі сягае да 40 метраў. Прычым, глыбока ад самага берага. Кар'еры капалі своеасаблівым конусам, без прыступак. Дна зусім не бачна. Нейкія хлопцы спрабавалі яго дастаць, але марна. Трэба лішні раз падумаць, ці рызыкаваць лезці ў ваду, бо выратаваць потым будзе надзвычай цяжка.

«Вада ці трымае?» — «Ну, не мора, канечне, але троху трымае». Так размаўляюць паміж сабой мінскія хлопцы, што выправіліся на адпачынак.

«У мяне крэйда ўжо на зубах трашчыць», — кажа іншы авантурыст.

Я толькі намачыў ногі, потым пальцы былі белымі. Нібыта трымаў іх у вадзе, у якой мылі анучу ад школьнай дошкі. Таму купанне там на вялізнага аматара — выглядае прыгожа, але ці ёсць у гэтым вялікая асалода.

Дарэчы, мы былі далёка не адзінымі турыстамі на Краснасельскіх кар'ерах у той вечар. Стаяла з дзясятак машын і столькі ж намётаў. Смажыліся шашлыкі, пілося піва. Прычым, аўтамабілі былі спрэс з мінскімі нумарамі. Мясцовым такі экстрым ужо малацікавы.

Удалося пабачыць толькі адзін кар'ер, а іх там такіх з паўтузіна. Ёсць і з зялёнай вадой. Кажуць, выгляд не менш фантастычны.

Дзеля моцных уражанняў ехаць глядзець на крэйдавыя кар'еры трэба абавязкова. Праўда, дыванкі ў машыне потым набылі характэрны белы колер. Але гэта невялікі такі прыкры мінус.

### А пакупацца можна і ў Зэльве

На зваротнай дарозе заязджаем у Ваўкавыск. Горад зялёны і дагледжаны. Праязджаем міма старога гарадзішча, а таксама доміка военачальніка Баграціёна, які ў вайне 1812 года меў тут штаб.

На цэнтральнай плошчы ля фантана стаіць помнік ваўку. Вушы і лыч у жывёлы нацёртыя да бляску — на ўдачу.

Па вуліцах шпарка лётаюць таксоўкі з нумарам 22222, якія некалі належалі Мікалаю Аўтуховічу.

У суботу вечарам у горадзе праблема падсілкавацца, бо ўсе кавярні зарэзерваваныя пад вяселлі. Іх у гэты час сапраўды шмат.

Тым жа, каму так і не хапіла вады на кар'ерах, ёсць зваротная дарога і Зэльвенскае вадасховішча. Цудоўны гарадскі пляж і цёплая вада выдатна кампенсуюць некупанне ў рызыкоўных краснасельскіх кар'ерах.

**Зміцер Панкавец**

# Загадкі Крэўскага замка

14 жніўня спаўняецца 625 гадоў Крэўскай уніі. Піша **Алег Дзярновіч**.

### Унія ці акт?

Сёлета мы маем юбілей не толькі Грунвальда, але і падзеі, якая шмат у чым і прадвызначыла з'яўленне беларуска-польска-літоўскіх войскаў на Грунвальдскіх палях. 14 жніўня спаўняецца 625 гадоў з дня падпісання ў Крэўскім замку акта, які ўвайшоў у гістарыяграфію пад назвай Крэўская унія. Дыскусіі пра палітычныя і культурныя наступствы гэтай падзеі для Вялікага Княства яшчэ доўга не сціхнуць.

Сярод прафесійных гісторыкаў, асабліва літоўскіх і часткова беларускіх, апошнім часам пашыраецца тэндэнцыя замест азначэння «Крэўская унія» выкарыстоўваць тэрмін «Крэўскі акт». Бо ўрэшце дакумент аказаўся, кажучы мовай сённяшніх дзелавых папераў, «дэкларацыяй аб намерах». Вялікі князь літоўскі Ягайла, узыходзячы на польскі трон, даў многа абяцанняў, галоўным з якіх было далучэнне ВКЛ да Кароны «на вечныя часы».

Але Княства ўрэшце не было інкарпараванае, а захавала свой, няхай усечаны, суверэнітэт і часам мела асобнага ад Польшчы манарха (Жыгімонта Кейстутавіча, Аляксандра да абрання яго польскім каралём і г.д.). З іншага боку, як і абяцаў Ягайла, паганцы-літоўцы былі ахрышчаныя паводле лацінскага абраду. Адначасова грамадства Вялікага Княства паступова пераняло многія дзяржаўныя і палітычныя інстытуты Польшчы.

Дзяржава Гедымінавічаў захавалася як асобны дзяржаўна-палітычны арганізм. Але трывалы дзяржаўны саюз Польшчы і ВКЛ праіснаваў ад канца XIV да XVI ст., да фінальнага ў гэтай гісторыі заключэння Люблінскай уніі.

Гадавіна Крэўскай уніі дае добрую падставу распавесці пра месца, дзе быў падпісаны гэты супярэчлівы акт, — пра Крэўскі замак.

### Па крыжацкіх узорах

Крэўскі замак, які паводле сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу знаходзіцца ў вёсцы Крэва Смаргонскага раёна, ёсць адной з першых мураваных кастэляў ВКЛ. Такія замкі маюць форму прастакутніка ці трапецыі і вядуць радавод яшчэ з часоў Рымскай імперыі, ад умацаваных лагераў для легіёнаў. У рымлянаў гэты ўзор запазычылі арабы, а ў тых — ужо еўрапейскія рыцары ў часе крыжовых паходаў.

У Вялікім Княстве рэгулярныя замкі спачатку будаваліся на ўзор крыжацкіх лагербургаў: прастакутная пляцоўка абносілася суцэльным перыметрам мураваных сцен з баявымі галерэямі (так першапачаткова было ў Лідскім замку) ці падвойным шэрагам мураваных сцен, знешняя з якіх была ніжэйшай (першы Ковенскі замак). Куты ўмацоўвалі вежамі.

Крэўскі замак быў узведзены каля месца ўпадзення рачулкі Шляхцянкі ў Кравянку. Каля чвэрці замкавай тэрыторыі (яе паўночная частка) знаходзілася на пясчанай выдме, што ўзвышалася над балоцістым рачным поплавам. Размяшчэнне замка ў забалочанай нізіне перашкаджала падцягнуць сценабітныя машыны ў часе аблогі. Здавалася б, пагоркаў у ваколіцах Крэва хапае, можна было мураваць замак на любым з іх. Але «балотная» канцэпцыя дала плён: хоць Крэва і месціцца на бойкім месцы, невядома ніводнага выпадку, каб замак штурмавалі крыжакі. У пазнейшыя часы пад яго падыходзілі крымскія татары, а ўрэшце разбурылі швэды ў XVIII ст. і расейскія гарматы ў Першую сусветную (у адной з вежаў замка немцы зрабілі агнявую кропку).



Крэўскі замак сёння.



Хто глядзіць на нас з XIV стагоддзя? Фрагмент крэўскага роспісу.



Уваход у склеп, дзе быў задушаны Кейстут.

### Месца пагадненняў і палітычных забойстваў

Магчыма, будаўніцтва ўмацаванняў у Крэве пачалося яшчэ Гедымінам. Гэты вялікі князь у 1323 г. звярнуўся да Ганзы — гандлёвага саюзу гарадоў Паўночнай і Цэнтральнай Нямеччыны. Ён абяцаў хрысціцца разам з падданымі і запрашаў еўрапейскіх спецыялістаў жыць у ВКЛ. Урэшце Гедымін так і не хрысціўся, але замкаў з нямецкай дапамогай набудаваў. Пасля аб гэты «каменны пояс» не раз ламалі іклы нямецкія ж рыцары-крыжакі.

Але больш пашыранай застаецца версія, згодна з якой замак збудаваў між 1338 і 1345 князь Альгерд. Ён атрымаў Крэва ад бацькі, князя Гедыміна, і зрабіў там сваю рэзідэнцыю.

У Крэве ж у 1345 г. ён заключыў з пасламі свайго брата Кейстута кампрамісную пагадненне пра падзел улады ў ВКЛ. Браты скінулі з віленскага трона слабейшага духам брата Яўнута і дамовіліся, што пры вярхоўным уладару Альгерду, блізкім да русінскіх падданых, вялікія паўнамоцтвы захавае і Кейстут, апошні абаронца паганскай Літвы.

Кейстут, дарэчы, і скончыў жыццё ў Крэве. Пасля смерці Альгерда яго сын Ягайла схапіў старога дзядзьку і пасадзіў у склеп пад Княскай вежай. Там яго, згодна з летапісам, задушылі падасланыя Ягайлам забойцы. У той самай вежы, толькі не ў падвале, а ў адным з верхніх ярусаў, быў увязнены і Кейстутаў сын Вітаўт. Ён, кажа легенда, збег з палону ў жаночай вопратцы. Так пачаўся яго шлях да вярхоўнай улады.

У часе даследавання Крэва ў 1980-я археолагі расчысцілі ўваход у скляпенні, дзе загінуў Кейстут. Аднак спускацца не наважваліся, баючыся абвалу вежы.

Ёсць версія, што Крэўскі замак літаральна можа быць дзядулем усіх іншых беларускіх замкаў, бо збудаваны ў канцы XIII ст. Гэтую версію прапагандавалі як літоўскія даследчыкі (С.Абрамаўскас), так і беларускія (А.Трусаў, І.Чарняўскі). У часе раскопак у 1960—1990-я выявілася, што сцены ля падмуркаў змацаваныя глінянай рошчынай, як рабілі ў XIII ст. (пазней выкарыстоўвалі толькі вапну). Таксама канцом XIII стагоддзя, паводле дэндрахраналагічнага аналізу, датаваны драўляны кавалак рыштаванняў, знойдзены ў часе раскопак. Праўда, звесткі гэтыя прыблізныя, бо для нашага рэгіёна не распрацаваная дакладная шкала такога аналізу (год спілу дрэва можна вызначыць па таўшчыні гадавых колцаў на зрэзе дрэва — у залежнасці ад кліматычных умоў кожнага канкрэтнага года будзе рознай і іх шырыня).

І ўсё ж — хто мог у канцы XIII ст., пры князю Віценю, будаваць каменны замак? З нямецкімі карпарацыямі майстроў яшчэ не былі ўсталяваныя такія мірныя і прадуктыўныя кантакты, а ўласнага досведу і тэхналогій Вялікае Княства тады не мела.

### Сляды страчанага сакрэту

Падчас раскопак Княскай вежы ў 1988 г., якімі кіраваў Ігар Чарняўскі, была зробленая сенсацыйная знаходка: звыш дзвюх тысяч фрагментаў сценапісу — тынкоўкі з роспісам. Гэтыя роспісы былі выкананы ў тэхніцы *al secco*, г.зн. па сухой тынкоўцы, і таму іх дакладней называць не фрэскамі, а менавіта сценапісам. Фрэскі ж робяцца па вільготнай тынкоўцы і мусяць у яе «ўсмоктвацца». Ярусы Княскай вежы абваліліся і ўвесь роспіс апынуўся ў будаўнічым друзе.

Вывучэнне гэтых фрагментаў паказала, што роспіс меў многа слаёў. Сёння можна сказаць, што вылучаюцца тры этапы аздаблення інтэр'ераў вежы роспісам: 1) у першай палове XIV ст.; 2) у пачатку XV ст.; 3) на мяжы XVII—XVIII стст. Найстаражытнейшы роспіс першай паловы XIV ст. быў зроблены праз танаванне тынкоўкі чырвонымі вохрамі. Для роспісаў пачатку XV ст. было ўжо характэрным ужыванне больш багатай колеравай палітры. Асабліва прыцягнула ўвагу даследчыкаў тое, што майстры выкарыстоўвалі блакітную фарбу, падобную да *«егіпецкай сіняй»* фарбы. Сіні пігмент атрымлівалі праз плаўленне меднай солі (вокісу медзі), соды, пяску і крэйды. У антычнасці гэта была адна з найбольш папулярных фарбаў і менавіта «егіпецкую сінюю» выкарыстоўвалі для аздаблення мармуровых скульптураў і фрызаў Парфенона.

Гісторыкі мастацтва лічаць, што рэцэпт гэтай фарбы быў забыты яшчэ ў VIII—IX стст. Значыць, нейкая пазнейшая версія рэцэпта ўсё ж захавалася ў Сярэднявеччы і была ўжытая ў Крэўскім замку. Вырабіць фарбу маглі таксама нямецкія майстры. Тэхналогія крэўскіх роспісаў мае выяўныя заходнееўрапейскія гатычныя рысы.

У Троцкім жа замку Вітаўта, нагадаем, фрэскі былі выкананыя ў візантыйскай стылістыцы. Тут ёсць пэўны культурны парадокс — Крэва, якое належала больш блізкім да русінаў Альгерду і потым ягонаму сыну Ягайлу, мела гатычныя роспісы, а Вітаўт з Кейстутавай лініі ўпрыгожыў сваю гатычную рэзідэнцыю візантыйскім сценапісам.

На мяжы XVII—XVIII стст. роспісы ў Крэве былі часткова абноўленыя. Гэта сведчыць, што Крэўскі замак быў адноўлены пасля вайны з Масковіяй 1654—1667 гг.

Чаму факт знаходкі ўнікальных крэўскіх роспісаў не выклікаў дыскусіі? Для гісторыкаў культуры гэта навіна першаразрадная. Праблема бачыцца ў заняпадзе навуковай рэстаўрацыі ў Беларусі. Сама канцэпцыя рэстаўрацыі ці рэканструкцыі Крэўскага замка дагэтуль не вызначаная. А займацца яшчэ роспісам — дадатковы галаўны боль і выдаткі і так у няпэўнай справе беларускай рэстаўрацыі.

Фрагменты роспісаў чакаюць больш удзячных часоў.

**Што абяцаў Ягайла**

«Вялікі князь Ягайла з усімі братамі, яшчэ не ахрышчанымі, а таксама з крэўнымі, са шляхтай, зямянамі, якія на землях яго жывуць, хоча, зычыць і прагне прыняць веру каталіцкую. Не маглі схіліць яго да гэтага, як настойліва не дамагаліся, шмат якія цэзары і розныя князі. Дзеля несумненнасці і моцы сказанага абяцае вялікі князь Ягайла сабраць і выкарыстаць усе свае скарбы для вяртання страт, якія панеслі як Польшча, так і Літва. …Вялікі князь Ягайла абяцае …двойчы сто тысяч фларэнаў сабраць і выплаціць. Той жа вялікі князь Ягайла абяцае і гарантуе ўласнымі сродкамі і намаганнем вярнуць каралеўству Польскаму ўсе краі, кім бы яны ад яго не былі адарваныя. Абяцае вярнуць вольнасць усім хрысціянам, у першую чаргу з зямлі польскай звычаем вайсковым забраных і пераселеных, і кожны або кожная будзе мець магчымасць падаца туды, куды захоча. Нарэшце, той жа вялікі князь Ягайла абяцае землі свае літоўскія і рускія на вечныя часы да Кароны каралеўства Польскага далучыць».

**З тэксту Крэўскай уніі, 1385**

# Геніюш: 100 гадоў пад забаронай

**Святкаванне стогадовага юбілею Ларысы Геніюш вылілася ў супрацьстаянне з уладамі. Ёсць інфармацыя, што асабістую справу Геніюш з архіва КДБ чытаў асабіста Лукашэнка.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

З Польшчы прыехаў ўнук Ларысы Геніюш — Міхась.

Сёлета яно было асабліва выразным. Спачатку ў Ваўкавыску раптоўна знікла шыльда ў гонар паэткі, што была вывешаная на доме, у якім Ларыса Геніюш нарадзілася. У дадатак на некалькі гадзін у пастарунак трапіў ініцыятар вывешвання — мясцовы прадпрымальнік Мікалай Кавальчук. А потым ужо ў Зэльве ўлады ў адкрытую сарвалі мемарыяльную дошку з дома, у якім жыла Ларыса Геніюш. У абодвух выпадках дамы былі прыватнымі, а з гаспадарамі была дасягнутая дамоўленасць на размяшчэнне памятных знакаў. То бок ніякіх юрыдычных падставаў для зрывання не існавала.

Некаторыя звязваюць такія дзеянні ўладаў не столькі з асобай Ларысы Геніюш, колькі з актыўным удзелам у святкаваннях кампаніі «Гавары праўду». Уладзімір Някляеў дапамагаў з вырабам шыльдаў, з удзелам яго кампаніі быў выдадзены альманах «Асоба і час», прысвечаны Геніюш, а таксама шыкоўны двухтомнік паэткі. Актывісты кампаніі ўдзельнічалі ва ўсіх святочных мерапрыемствах, а сам Някляеў быў галоўным выступоўцам на іх.

Ці варта ўвязваць перашкоды з удзелам «Гавары праўду»? Кіраўнік аргкамітэта па святкаванні юбілею Геніюш, Міхась Скобла, лічыць, што не. «У папярэднія юбілеі не брала ўдзелу ніякая кампанія. Але нам усё адно перашкаджалі, не давалі памяшкання. Так што не ў кампаніі «Гавары праўду» прычына, — лічыць М.Скобла. — Кіраўнік кампаніі, Уладзімір Някляеў, напісаў выдатны верш пра Ларысу Геніюш. З яго дапамогай выйшаў двухтомнік паэткі, альманах, прысвечаны ёй. Гэта — канкрэтная дапамога. Я лічу, што гэта і ёсць вялікая заслуга Някляева. А тое, што не даюць адзначаць, — тое сталася ўжо заганнай традыцыяй».

Спадар Скобла лічыць, што перашкоды — чынавенскія перастрахоўкі. Бо, паводле яго словаў, асабіста Лукашэнка не выказаў яснага стаўлення да Геніюш: «Паводле маёй інфармацыі, асабістую справу Ларысы Геніюш, што знаходзіцца ў КДБ, глядзеў, гартаў, чытаў асабіста Аляксандр Лукашэнка. І паставіў на ёй свой подпіс. Мабыць, азнаёміўся. Але ніякай сваёй думкі не выказаў. Ні за, ні супраць. І чыноўнікі цяпер баяцца зрабіць не так, як падумаў Аляксандр Лукашэнка».

Уладзімір Някляеў трымаецца іншага меркавання: «Я не хачу цягнуць коўдру на сябе. Але як паказалі падзеі ў Ваўкавыску і Зэльве, гэта звязана з удзелам нашай кампаніі. У мінулыя гады, калі святкаванні праводзіліся без нас, такіх праблем не было, — зазначае ён. — Зараз ізноў пачалі ціск на нас, арыштоўваюць нашых актывістаў па ўсёй краіне. Улады хочуць адштурхнуць людзей ад усяго, што звязана з кампаніяй «Гавары праўду». Маўляў, калі ёсць Някляеў, то мае адбыцца нядобрае. Не тое, каб ім замінае Ларыса Геніюш. Як яна ім можа замінаць? Яны пра яе не ведаюць. Ім замінае ўсё, што пагражае ім. Чыноўнікі хочуць утрымліваць уладу і бачаць у нашай кампаніі пагрозу для сябе».

Разам з тым, спадар Някляеў лічыць, што яго кампаніі ўсё адно было варта ангажавацца ў святкаванне юбілею Ларысы Геніюш. «А тады дзе нам ангажавацца? Плакаць на магілках? Мы ўдзельнічалі актыўна. І я дапамагаў не толькі таму, што я лідэр кампаніі «Гавары праўду». Я — беларускі паэт. Насамрэч паважаю ўсё тое, што зрабіла Ларыса Геніюш. Асабліва «Споведзь». Гэта і ёсць праўда. Сказаная ў той час, калі яе цягалі па гулагах, па калючых дратах. Гэта і ёсць маральны подзвіг жанчыны, які павінен выхоўваць чалавечае ў чалавеку», — зазначыў У.Някляеў.

Святкаванне юбілею Геніюш у Зэльве не было залішне палітызаваным. Абышлося без інцыдэнтаў. Хіба што святар зэльвенскай царквы, жадаючы перастрахавацца, забараніў уздымаць нацыянальны сцяг ля помніка паэтцы, што акурат стаіць пры царкве.

А Някляева прысутныя на святкаванні насамрэч успрымалі як паэта, а не як палітыка. Гэта асабліва было заўважна пасля прыезду ў Зэльву Аляксандра Мілінкевіча, які, спяшаючыся з інаўгурацыі польскага прэзідэнта Браніслава Камароўскага, паспеў толькі на ўскладанне кветак да магілы Геніюш. З'яўленне Мілінкевіча выклікала вялікае ажыўленне ў прысутных.

З іншых грамадскіх лідэраў Зэльву наведаў таксама лідэр БНФ Аляксей Янукевіч.

Нягледзячы на неадназначнае стаўленне да Ларысы Геніюш, зэльвенскія ўлады не змаглі цалкам праігнараваць юбілей паэткі. Першапачаткова нават планавалася правесці ў мясцовым Доме культуры вечарыну. Аднак, калі сотня чалавек, што прыехалі пераважна з Гродна і Мінска, падышлі да будынка, дзверы ў вялікую залу былі замкнутыя, а афіцыйнае мерапрыемства праходзіла ў маленькім памяшканні бібліятэкі, разлічаным на трыццаць чалавек.

«Вырашылі ад нас схавацца ў каморы», — жартавалі прысутныя. У выніку вершы Геніюш гучалі проста з прыступак ДК. За «непарадкам», не ўмешваючыся, назіраў дзяжурны міліцыянтаў.

Такім чынам, трыццаць чалавек у зэльвенскай бібліятэцы — гэта ўсё, што сёння здольная зрабіць дзяржава для ўшанавання памяці Ларысы Геніюш. Ні Міністэрства культуры, ні афіцыйны Саюз пісьменнікаў не палічылі патрэбным адзначаць стогадовы юбілей адной з самых вялікіх беларускіх паэтак.

«Мы нічога не планавалі. Вы ведаеце нашу пазіцыю па Геніюш і Арсенневай. Яны дзейнічалі супраць Беларусі, падтрымлівалі фашызм. Я ўвогуле слаба ведаю яе творчасць. Мяне больш цікавіць творчасць іншых паэтаў, нашых», — адказаў кіраўнік праўладнага СПБ Мікалай Чаргінец на пытанне карэспандэнта «НН».

Ларыса Геніюш была сакратаркай Рады БНР. Яе муж Янка Геніюш атрымаў вышэйшую медычную адукацыю ў даваеннай Чэхаславаччыне па тагачаснай «праграме Каліноўскага» для заходніх беларусаў, якую падтрымлівалі чэшскія ўлады. Урэшце Геніюшы засталіся ў Празе, дзе Янка працаваў як венеролаг. У 1948 годзе камуністычныя ўлады акупаванай саветамі Чэхаславаччыны выдалі яе СССР. Геніюш прайшла праз допыты Цанавам і савецкія канцлагеры. Да смерці яна не прыняла грамадзянства СССР.

Геніюш вядомая як выдатная пісьменніца. Некаторыя яе вершы сталі песнямі. Яе мемуары «Споведзь» пабачылі свет толькі пасля смерці, у час перабудовы. Яны сталі бестселерам канца 1980-х.

9 жніўня 2010 года Геніюш споўнілася б 100 гадоў. У сувязі з гэтай датай шэраг нацыянальных арганізацый абвясцілі ўвесь 2010 год годам Геніюш.

Савецкія і лукашэнкаўскія ўлады дагэтуль не рэабілітавалі Геніюш.

**Алесь Пілецкі**

# Турысты замест манахаў

**У кляштары бернардзінцаў у Мінску ўсё-такі пабудуюць гатэль.**

Пра гэта заявіў галоўны інжынер КУП «Мінская спадчына» Міхаіл Жых. «Кляштара там не будзе. Там будуць гатэльныя нумары, бо функцыянальнае прызначэнне найбольш набліжанае да манастырскіх келляў». Тое, што ў выніку помнік архітэктуры страціць свае адметныя рысы, сп. Жыха не бянтэжыць. Ён расказвае, што «гэта будуць не камфортныя пяцізоркавыя нумары, але нам удасца аднавіць стыль і стварыць гатэльныя нумары з максімумам выгоды для сучаснага спажыўца».

Першыя звесткі аб пабудове гатэля з'явіліся пяць гадоў таму. У Адміністрацыю прэзідэнта было перададзена больш за 30 тысяч подпісаў з просьбай пра передачу кляштара каталікам. Тады працы амаль на тры гады спынілі.

Скончыць будаўніцтва гатэля маюць у 2013 годзе. Праект увайшоў у праграму падрыхтоўкі горада да Чэмпіянату свету па хакеі. Існуе і ідэя стварэння ў комплексе некалькіх музеяў: археалогіі, манастырскага побыту, карэт і пажарнай справы.

Згодна з праектам, у гатэлі будуць 84 нумары. На падземным узроўні прадугледжваецца паркінг на 68 месцаў, рэстаран, боўлінг, більярд, бізнэс-цэнтр, басейн, адкрыты тэнісны корт, а на пятым паверсе — прэзідэнцкі люкс.

**Кастусь Матушыч**

**Кляштар бернардзінцаў**

заснаваны ў 1624. Пасля рэканструкцыі 1752 будынкі набылі сённяшнія рысы. У 1864 касцёл прыстасавалі пад праваслаўную палкавую царкву (з 1872 — архіў), а карпусы — пад казармы. Сёння ў ім размяшчаюцца Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі і Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

## Сцісла

• **У Мінску плануецца аднавіць частку рэчышча Нямігі.** Рэалізацыя праекта па стварэнні гістарычна-археалагічнага цэнтра на тэрыторыі былога Мінскага замчышча можа пачацца ў 2011-м. Да канца гэтага года будзе гатовы экспазіцыйны план будучага музея пад адкрытым небам. Паміж праспектам Машэрава і ракой Свіслач, непадалёк ад метро «Няміга», маюць аднавіць частку збудаванняў XII ст. і частку рэчышча Нямігі. Зверодліві будынак Дома фізкультурнікаў у такім разе знясуць.

• **На фестываль феерверкаў пад Лагойскам запрошаны «Бі-2» і «Акварыум».** Другі міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца» пройдзе 27—28 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск». Цана квітка на кожны дзень складае 80 тысяч рублёў.

• **Лаўрэаты конкурсу да 100-годдзя Ларысы Геніюш.** Конкурс быў абвешчаны аб'яднаннем літаратараў-хрысціянаў «Дабравест». Удзел у ім узялі 26 аўтараў. Спецыяльныя прызы атрымалі Галіна Ярашэвіч з Баранавіч за цыкл песняў на вершы Ларысы Геніюш і Гісторыка-патрыятычны клуб «Спадчына» з вёскі Дзварэц Дзятлаўскага раёна (удзельнікі клуба — моладзь ад 12 да 16 гадоў). Пераможцамі конкурсу сталі: Алена Сурба (Гродна), Эдуард Гракович (Мінскі раён), Марыя Баравік (Глыбоцкі раён), Алесь Корнеў (Баранавічы), Марыя Шлык (вучыцца ў Мінску), Зоя Жук (Гродна), Алесь Вярцейка (вучыцца ў Мінску).

• **«Ваўкоў» Колбышава ўбачаць ва Украіне.** Фільм трапіў у конкурсную праграму XIII Бярдзянскага міжнароднага кінафестывалю. Мастацкі фільм «Ваўкі» — рэдкая для Беларусі антысталінская стужка.

**СМ**




# Новыя апавяданні пра Леніна -2

**Клім Клімч-Клімевіч.**

## Ленін і абяцанне

Ленін любіў даваць абяцанні. Ён абяцаў налева і направа, абяцаў усім і кожнаму паасобку, абяцаў шмат і ўсё, абяцаў сёння і заўтра, абяцаў Сонца і Месяц, абяцаў пасадзіць і выпусціць, абяцаў выканаць і перавыканаць, абяцаў асабіста і пад кантролем, абяцаў абяцанага і абяцаў абяцанага абяцанага. За што Леніна любілі не толькі яго дзеці, але нават Леніны іншых краін. Пра што яму не прамінуў нагадаць суседні Ленін.

— Ленін, — патэлефанаваў ён неяк Леніну, — ты ў курсе, што мы зацікаўленыя ў тым, каб прызналі Паўднёваасецістанію і Абхазастанію?

— У курсе, — паныла сказаў Ленін, які не любіў, калі яму псавалі настрой, няхай нават гэта і быў Ленін.

— Але гэта не самамэта, — Ленін больш шырока разгарнуў перад розумам Леніна сваю думку. — Такой задачы не стаяла і не стаіць.

— Ясны факт, — адказаў Ленін, паспрабаваўшы спасцігнуць усю глыбіню ленінскай думкі і ленінскую ж логіку, але яму не ўдалося.

— Дарэчы, помніцца, — недарэчы для Леніна ўзгадаў Ленін, — нехта мне не так даўно сказаў наступнае: «Урачыста абяцаю, што ўсё зраблю за самы кароткі тэрмін». Гэта значыць, прызнаю гэтыя краіны за краіны. Не памятаеш, хто б гэта мог быць?

— Не, — хутка вымавіў Ленін, які часам хутка забываўся на дрэннае. — Можа быць — Я? У сэнсе не Я, а той, хто табе сказаў: «Я абяцаю...»

— Лагічна, — пагадзіўся з такой пастаноўкай здагадкі Ленін. — Так, сапраўды, гэта быў менавіта Я. Хутка і чарговы фільм пра яго выйдзе па адным з нашых незалежных тэлеканалаў. Паглядзі абавязкова.

— Ясны пень, — падзякаваў Леніну Ленін за выказаную ўвагу. — Абавязкова. Усеабавязкова.

— Рады быў цябе пачуць, Ленін, — развітаўся з Леніным Ленін і адключыў мабільны.

— Сука якая, — задуменна вымавіў Ленін. — Не Ленін, а Астрахан нейкі — фільм за фільмам здымае. Што ж рабіць?..

Ленін падышоў да стала і ўзяў у рукі фатаграфію, з якой не на яго, а адзін на аднаго глядзелі Кур'ян і Ленін Грузістаніі. Ленін прачытаў подпіс — «Мудраму і роднаму Леніну ад Дзяніскі і Мішыко» — і вярнуў фота на стол. Так — нешта трэба было рабіць. Але што?..

## Ленін і ТБ

Ленін сеў у ленінскі фатэль і ўключыў ленінскі тэлевізар. На адным з сумесных каналаў трансляваўся выпуск навінаў, у якім Ленін суседняй дзяржавы раіўся са сваімі дзецьмі, як іх краіне жыць далей. Ленін скрывіўся і пераключыў на іншы сумесны канал. Па ім выступаў адзін з дзяцей Леніна суседняй дзяржавы, які сцвярджаў, што іхні Ленін значна лепшы за не іхняга Леніна. «Бач ты сука якая, — плюнуў у экран Ленін. — Ну, прыедзеш ты яшчэ сюды. Каб ты спрах».

Ленін падняўся з фатэля, выцер ленінскі плявок з ленінскага шырокафарматнага плазменнага экрана і тыцнуў кнопкай на іншы канал, па якім у праграме пра жывёлаў расказвалася пра тое, да чаго Ленін давёў у ленінскіх пушчах сваіх зуброў. Ленін шпурнуў пульт у тэлевізар, з хвіліну паразглядаў аскепкі, панюхаў дым і патэлефанаваў у ленінскі званок. «Як бы галоўнага па тэлевізары да мяне, — перадаў ён ленінскую просьбу памочніку. — І няхай праграму перадач на заўтра возьме».

Праз хвіліну галоўны па ленінскіх тэлевізарах быў у кабінеце. «Як сям'я, як дзеці?» — пацікавіўся Ленін і прыжмурыў усім добра вядомыя вочы на суразмоўцу. «Дзякуй», — няўпэўнена адказаў як бы галоўны і збялеў. «Я так і думаў. Нічога апошнім часам у цябе не знікала?» — яшчэ ласкавей прыжмурыўся Ленін. «У сэнсе?» — затрэсліся вусны тб-як бы-начальніка. «Ва ўсіх сэнсах, — узрадаваў яго Ленін. — Добра. Спачатку давай праграму на заўтра паглядзім, а потым вырашым, што з табой рабіць. Справа твая так ці інакш дрэнь, праўда?» Ленін прыязна засмяяўся і ўзяў праграму з пашарэлых рук падначаленага.

«Інтэрв'ю з Леніным Грузістаніі», — прачытаў Ленін. — Не зразумеў, было ж ужо!» «Гэта другая частка, больш шчырая», — хутка прагаварыў як бы суразмоўца. «Шчырая — гэта добра, — заўважыў Ленін. — Люблю шчырых людзей. «Інтэрв'ю з Юрыем Шаўчуком». Пасуе. «Інтэрв'ю з Леніным Малдовастаніі». Выдатна. «Публіцыстычны фільм» Мядзведзь у берлагу — 1». Трэба будзе паглядзець. Так. Што па іншым канале? Перадача пра здароўе: «Лячэнне ціпуна без наркозу». Гм. Давай лепш так: «Лячэнне ціпуціна без наркозу». Дамовіліся? «Інтэрв'ю з Міхаілам Барзыкіным». У кропку. «Інтэрв'ю з Леніным, што хаваецца ў лясах Чачнястаніі». Выдатна. «Інтэрв'ю з Валерыяй Навадворскай»... З кім інтэрв'ю?» «Гэта тэматычнае інтэрв'ю, — яшчэ хутчэй прамармытаў як бы галоўны. — Пра іхняга Леніна». «Пра іхняга — гэта тое, што трэба вашаму народу, — шматзначна зацвердзіў Ленін. — А то я ўжо быў падумаў, што справа твая зусім дрэнь. Што на гэтым канале? «Інтэрв'ю з Гары Каспаравым». Пойдзе. «Інтэрв'ю з Эдуардам Лімонавым». М-да. Пойдзе. «Інтэрв'ю са Збігневам Бжэзінскім». Малайчына. Балет «Лебядзінае возера». Ну што ж — цікавая, разнастайная праграма. Можаш жа, калі захочаш. Толькі адна заўвага. Балет будзе такі — «Нарачанскае возера». Ты не супраць? Ну, ідзі. Не знікай надоўга. І скажы там, каб цябе пакармілі».

Як бы галоўны па тэлевізарах ступіў за дзверы кабінета, а Ленін узяў у рукі шуфлік і пачаў збіраць з падлогі аскепкі экрана.

## Ленін і хадок

Ленін моцна паціснуў руку хадаку, ганароваму грамадзяніну горада Уладзівасток (далей — ГГГУ), глыбока зірнуў яму ў вочы і падсунуў да яго крэсла.

— Сядайце, — Ленін зрабіў запрашальны жэст рукой. — Сядайце, дарагі вы мой, і расказвайце. Расказвайце, што бачылі, што даведаліся пра іх краіну.

ГГГУ павесіў на спінку крэсла авоську, даверху набітую рулонамі туалетнай паперы з яго партрэтам, і прысеў.

— Таварыш Ленін, — пачаў ён, — насуперак таму, што я прыехаў у вашу краіну з тупой Латвіі, мяне адразу ўразілі вашыя дарогі. Яны мяне проста зачаравалі. Я разбіраюся ў дарогах. Я бачыў амерыканскія дарогі, гэтыя тупыя амерыканскія дарогі. Вашы дарогі значна прасцейшыя, асабліва ад гарызонту да гарызонту, нібы Ленін накрэсліў іх пад лінейку на карце.

— Так яно і было! — усклікнуў Ленін. — Усімі дарогамі ў іх краіне займаюся я асабіста. Гэта мая пазіцыя як Леніна іх краіны.

— І я падумаў, — ГГГУ пакруціўся на крэсле, быццам спрабуючы намацаць на сядзенні кнопку, — і я падумаў, што наш Ленін несправядліва паводзіць сябе ў дачыненні да вашай краіны. Газеты, тэлебачанне здзекуюцца з Леніна вашай краіны, з таго, што ў вашай краіне нічога няма, акрамя бульбы.

— Я табе так скажу, — паказаў Ленін пальцам на «Коммерсант», адкрыты на пятай старонцы. — Выбачай мне такую няленінскую, можа быць, шчырасць, але газет вашых я ўжо даўно не чытаю. А з тэлебачання я гляджу толькі «Пражэктарпэрысхілтан», і тое не ўвесь. А тратуары іхнія ты бачыў?

— Вось, — прыпадняў хадок ступню, на якой быў тапак. — Мне было сорамна хадзіць у маім вулічным абутку па вашых ходніках — настолькі яны чыстыя. Але што самае дзіўнае, пакуль я ехаў па вашых дарогах, ніводнага тэрарыстычнага акта са мной не здарылася! Дзіўна, але ніводнага! І ніводны малады наркаман не трапіўся мне па дарозе, ніводны алігарх, ніводны хросны бацька і пахан!

— У іх краіне з паханамі проста робяць, — Ленін паказаў на кабуру, што вісела ў яго на пасе. — Нядаўна там зноў двум дзецям вынеслі суровае, але справядлівае пакаранне. З культурай іх паспелі азнаёміцца?

— Натуральна! — ГГГУ пакапаўся ва ўнутранай кішэні пінжака і дастаў кнігу. — Я зайшоў у вашу бібліятэку, якой можа пазайздросціць любы тупы Лондан. Вось, вось тая кніга, якую я шукаў у нашай краіне, а знайшоў у вашай. Зірніце.

— «Чабурашка і прэзерватыў», — прачытаў Ленін. — Не ведаў, што такія цікавыя кнігі ёсць у іх краіне.

— Ваша краіна — дзівосная краіна! — ГГГУ з трывогай паглядзеў на тое, як Ленін хавае кнігу ў шуфляду. — Асабліва мяне ўразіла ваша сельская гаспадарка і прыстойныя людзі — тыя, якія выраслі на прыродзе, а не ў кулуарах улады і гламурных катэджах. Асабіста я цвёрда ўпэўнены, што калі ў краіне шмат зямлі, то галоўным класам павінна быць сялянства. А калі сялянства няма, то рана ці позна паўстане недахоп прыстойных людзей, бо апора прыстойнасці — не ўлада і не банкі, а зямля і прырода.

— Дарагі мой хадок! — Ленін прыклаў руку да гарачага ленінскага сэрца. — Я заўзяты прыхільнік развіцця асабістых падсобных гаспадарак. І не толькі як Ленін, але і асабіста. У мяне карова ёсць. Проська-перадойка. Думаў спачатку завесці лыжы, але потым падумаў — навошта мне другія лыжы? І завёў карову, для душы. Таму што зямля ўвогуле робіць чалавека высакародным, а скаціна — тым больш. Вельмі правільна хтосьці заўважыў, што скаціна выхоўвае чалавека. Гэта і па мне бачна. Калі дзіця з дзяцінства круціцца там, дзе ёсць скаціна, — гэта потым зусім іншае дзіця. Карова ў маім жыцці ды і многіх жыццях іх краіны — гэта душа сям'і. Жыццё паказвае — там, дзе з дзяцінства прыцягваюць да працы, догляду скаціны і агародніцтва, там менш праблем з п'янствам і іншымі. У іх турму на экскурсію вас ужо звадзілі?

— А як жа! — кашлянуў хадок. — Паказалі мне шмат свабодных камер, прапанавалі — выбірай.

— Дзіўныя дзеці ў іх краіне! — засмяяўся Ленін такім усім добра вядомым і шчырым смехам. — Любяць працаваць, любяць і пажартаваць. Нядаўна з трох дзяцей там так пажартавалі, я тры дні рагатаў. Вы ўжо мне прабачце такую ленінскую шчырасць, якая многім не падабаецца, але я, гледзячы вашыя канцэрты па тэлевізары, так не рагачу.

— І вось яшчэ пра што я хацеў у канцы вам сказаць, таварыш Ленін, — ГГГУ падняўся з крэсла, узяў авоську і, як бы развітваючыся з Леніным і кнігай, зірнуў на закрытую шуфляду. — Мне вельмі да душы слова «Ленін». Якое дакладнае слова знайшлі людзі вам у вашай краіне!

...Ленін падышоў да акна і яшчэ доўга-доўга глядзеў услед хадаку, што адыходзіў кудысьці ўдалячынь. Ленін быў шчаслівы і думаў пра тое, як усё-такі шмат у вашым свеце разумных, сумленных і адкрытых дзяцей...



# Сонечная энергія становіцца таннейшай за атамную

Расце эфектыўнасць сонечных батарэй.

Вучоныя Універсітэта Дзюка ў ЗША падлічылі, што новыя сонечныя ўстаноўкі абыходзяцца танней, чым новыя атамныя станцыі.

Кошт атамнай энергіі складае 16 цэнтаў за кілават-гадзіну (энергія, неабходная для працы дзесяці 100-ватных лямпачак цягам гадзіны), у той час як кошт сонечнай энергіі складае 14 цэнтаў. Трэба ўлічваць, што Паўночная Караліна не «сонечны» штат, а ў паўднёвых рэгіёнах кошт будзе яшчэ ніжэйшы.

Даследаванні праводзіліся экалагістамі ў адказ на агрэсіўнае лабіраванне з боку атамнай індустрыі, якая імкнецца пазіцыянаваць сябе як найбольш выгадную па ўзроўні выкіду вуглякіслага газу ў атмасферу.

Па прагнозах навукоўцаў Універсітэта Дзюка, у наступнае дзесяцігоддзе сонечная энергія канчаткова стане самай таннай і даступнай.

«Безумоўна, сонечная энергія самая экалагічна чыстая. У паўночных штатах можна сустрэць шмат сонечных батарэяў на дахах», — зазначыў Станіслаў Шушкевіч, першы кіраўнік незалежнай Беларусі, фізік-ядзершчык па спецыяльнасці.

Але навуковец і палітык звяртае ўвагу і на іншыя факты: на сёння ў ЗША 100 ядзерных рэактараў працуюць ды 6 новых будуюцца.

«Пакуль што сонечныя батарэі былі значна даражэйшыя за атамныя станцыі», — упэўненая Валянціна Брылёва, адказная за сувязі з грамадскасцю Інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў у Соснах. Валянціна Брылёва адзначае, што на пачатковым этапе вытворчасць сонечных батарэяў шкодная — неабходна атрымаць чысты крэмній, а гэта не вельмі экалагічна чыстая працэдура.

Беларускія навукоўцы лічаць выкарыстанне сонечных установак для Беларусі не самым выгадным. Такі варыянт можа быць прадстаўлены толькі як лакальны, дадатковы. Станіслаў Шушкевіч сумняваецца ў магчымасці пабудовы эфектыўных сонечных установак у Беларусі, бо не кожны год будзе сонечным, як сёлетні.

Валянціна Брылёва звяртае ўвагу на адрозныя шляхі падлікаў. Можна па-рознаму ўлічваць эксплуатацыю, сабекошт паліва, тэрміны выкарыстання ды выдаткі на будаўніцтва. Тэрмін прыдатнасці атамнай станцыі можа быць да 60 гадоў. Сонечную батарэю трэба замяняць праз 25 гадоў. Вонкавы паліўны цыкл у эксплуатацыі атамнай станцыі вельмі танны. Аднак пры падліках эфектыўнасці атамнай энергіі ўлічваюць немалыя выдаткі на ўтылізацыю адкідаў. Пры разліках, напрыклад, кошту вугальнай энергетыкі такія параметры не ўлічваюцца.

**Юльян Місюкевіч**

# Ці ёсць у небе зорка БРСМ?

Піша астраном **Віктар Малышчыц**.

Хто з нас не марыў дастаць каханаму чалавеку зорку з неба! Ну, калі не дастаць, то хаця б проста падарыць. А калі і падарыць не ўдасца, то можна хаця б назваць якую зорку імем каханага, і няхай аб вашых пачуццях ведаюць дзясяткі пакаленняў тых, хто глядзіць на неба!

### Колькі гэта каштуе?

Кемлівыя прадпрымальнікі даўно падхапілі ідэю, і ўжо ў метро можна сустрэць абвесткі кшталту «зорка ў падарунак, купіць зорку, зорны падарунак...», дзе за пэўную плату вам прапануюць неймавернае — назваць адно з нябесных свяцілаў імем, якое вы прапануеце. Цэны на такую «прадукцыю» немалыя — ад 25 еўра за зусім слабыя зоркі да многіх соцень за тыя, што ледзьве бачныя без тэлескопа. А калі вы захочаце прыгожыя сертыфікаты ў рамачках, запіс гуку зоркі (цікава, а што такое «гук зоркі»?), трохмерныя карты наваколля і «пашпарт» зоркі, будзьце гатовыя да гэтай сумы дадаць яшчэ некалькі соцень ці нават тысяч еўра.

### Асцярожна, аферысты!

Няўжо гэта легальна? На сайтах большасці з такіх фірм вы абавязкова знойдзеце раздзел «Прававая аснова», дзе вам патлумачаць, што такая дзейнасць цалкам легальная. Праўда, афіцыйна яна будзе называцца чымсьці накшталт «выраб сувенірнай прадукцыі астранамічнай тэматыкі». Могуць нават даць спасылкі на патэнт. Але калі паглядзець на сам патэнт, то ён будзе выдадзены, напрыклад, на «Атракцыён «Турыстычны касмічны комплекс».

Гандаль зоркамі набыў такую папулярнасць, што нават Міжнародны астранамічны саюз (МАС) надрукаваў адкрыты ліст, дзе тлумачыць, што не мае дачынення да называння зорак і выдачы сертыфікатаў. Нагадаем, што МАС — найвышэйшы орган у астранамічнай наменклатуры, менавіта ён навёў парадкі сярод назваў і межаў сузор'яў у 1922 годзе, пазбавіў Плутон статуса планеты ў 2006-м і ўвёў тэрмін «плутоід». Са словаў прадстаўнікоў МАС, на небе існуе каля 300 зорак, што маюць уласныя назвы, якія захаваліся ад старажытных арабаў, грэкаў і рымлянаў. Калі мы пачнём даваць імёны тысячам зорак, хто ж іх запомніць?

Праўда, і самі фірмы гэта прызнаюць. Калі вельмі ўважліва чытаць між радкоў, на сайтах «зорных крамаў» можна ўбачыць, што за вашыя грошы вы атрымаеце толькі назву зоркі ў камерцыйным каталозе, якім не карыстаецца ніводзін прафесійны астраном, і прызнае назву вашай зоркі толькі фірма, якая вам яе прадала. Канкурэнты ж гэтую зорку, хутчэй за ўсё, «прададуць» камусьці іншаму.

### Хто купляе зоркі?

На прыгожую рэкламу купляюцца многія. Напрыклад, на замову Расійскай праваслаўнай царквы, у 2000 годзе фірма «Міжнародны зорны каталог» надала адной з зорак Вялікай Мядзведзіцы назву «Віфлеемская». А той, што побач, было дадзена імя «Ісус» (аб гэтым паведамляе сайт фірмы).

У Магілёве на Плошчы зорак побач з бронзавым астраномам з'явілася шыльда з паліраванага каменя, якая паведамляе, што адна з зорак Вялікай Мядзведзіцы цяпер называецца... «Зорка БРСМ»! Такі незвычайны «падарунак камсамольцам-нашчадкам» вырашылі зрабіць актывісты абласной арганізацыі. Што ж, ці ацэняць такі падарунак нашчадкі — пакажа час, а вось прадпрымальныя аферысты, у чые кішэні перайшлі некалькі мільёнаў бюджэтных грошай, — ацэняць дакладна!

Нават у самай перадавой установе адукацыі — Белдзяржуніверсітэце — ёсць стэнд, які паведамляе, што адной з зорак Андрамеды прысвоена назва «Зорка БДУ». Дарэчы, зорка была «купленая» нават насуперак абсерваторыі БДУ, якая імкнулася адгаварыць універсітэт ад такой сумнеўнай акцыі.



### Дык што ж падарыць?

Многія скажуць: гэтыя навукоўцы ўсё раскрытыкуюць, знішчаць усю рамантыку і прывабнасць неба! Што ж падарыць каханаму чалавеку? Насамрэч, найлепшы падарунак — гэта само начное неба. Выедзьце далёка за горад і пакажыце сваёй другой палове сапраўднае ззянне Млечнага Шляху — Шляху Продкаў, абрысы сузор'яў, раскажыце легенды пра іх — будзьце пэўныя: такі падарунак ацэніць кожны!

# Беларускія генетыкі вырошчваюць тытунь

Але курыць яго не збіраюцца. Найноўшыя напрацоўкі генных інжынераў.

Сорт бульбы, устойлівы да хваробаў і вірусаў; трансгенныя журавіны, саладзейшыя за натуральныя; трансгенныя козы, якія ўжо даюць малако; лён, устойлівы да гербіцыдаў і грыбкоў — гэта і многае іншае распрацоўвае лабараторыя малекулярнай генетыкі Каардынацыйнага цэнтра біябяспекі пры Інстытуце генетыкі і цыталогіі НАН. Паводле словаў загадчыка лабараторыяй акадэміка Мікалая Картэля, генетычна мадыфікаваныя расліны ў прамысловых аб'ёмах у Беларусі не вырошчваюць. Абмяжоўваюцца навуковымі доследамі.

Многія выпрабаванні робяцца на тытуні — ён хутка расце і зручны для вывучэння. Утрыманне нікаціну навукоўцаў не хвалюе. Больш цікавіць утрыманне бялка, маса і хуткаспеласць. Напрацаванае на тытуні плануецца перанесці на рапс, які апошнім часам не толькі кармавая расліна, але і крыніца біяпаліва.

Вырошчванне мадыфікаваных прадуктаў, прыдатных для ежы, патрабуе доўгіх выпрабаванняў, у тым ліку ў палявых умовах, кажуць навукоўцы. А неабходнага палігона ў Беларусі пакуль няма. Навукоўцы спадзяюцца займець яго ў наступным годзе.

У Беларусі кожны прадукт, які змяшчае ў сабе генетычна мадыфікаваныя рэчывы, мусіць мець адмысловую пазнаку. За тым, каб тое, што трапляе ў крамы, адпавядала беларускаму заканадаўству і міжнародным стандартам, сочыць Каардынацыйны цэнтр біябяспекі пры Інстытуце генетыкі і цыталогіі НАН. У асноўным, правяраюць прадукты з соі ды кукурузы.

Праца над стварэннем новых раслінаў увядзеннем генаў пачалася ў 1980-я. У якасці матэрыялаў для генных доследаў ужываюць кукурузу, сою, рапс — найбольш пашыраныя раслінныя культуры. Генная інжынерыя шырока развітая ў ЗША, Бразіліі, Канадзе. Еўропа доўгі час супраціўлялася новаўвядзенням. Аднак цяпер успрыняцце змяняецца. У 1999 г. толькі 10% апытаных станоўча ставіліся да мадыфікаваных прадуктаў. У 2005 гэты адсотак пераваліў за палову. У Іспаніі, Італіі, Даніі ў невялікіх аб'ёмах вырошчваюць генетычна мадыфікаваныя расліны.

**ЮМ**

# Чым харчавацца ў спёку

Спіс самых карысных і самых шкодных прадуктаў на гарачыя дні.



### Толькі не грыбы!

У першую чаргу, падчас спёкі трэба адмовіцца ад грыбоў — пры павышэнні тэмпературы яны часта становяцца ўмоўна ядомымі, а то і таксічнымі.

Таксама лепш адмовіцца ад цяжкай тлустай ежы — найперш ад мяса. Паспрабуйце не ўжываць бабовыя, а таксама печыва і хлеб — асабліва бутэрброды.

Самая карысная ежа ў спёку — гэта садавіна і гароднiна з высокім утрыманнем вадкасці: кавуны, памідоры, агуркі, дыні, шпінат. А суп можа замяніць увесь абед. Добра дапамагаюць у спёку сухафрукты, цвёрды сыр, арэхі, соль і вада з лімонам — менавіта гэтыя прадукты бралі з сабой у пустыню яе жыхары.

Перад сном лепш за ўсё выпіць шклянку кефіру без цукру. Увогуле рабіць акцэнт трэба на прадукты з вялікім утрыманнем вадкасці, якую арганізм губляе падчас спёкі.

Няблага было б перанесці сняданак гадзіну на сёмую ранку, а абедаць аб адзінаццатай — пакуль не наступіў пік спёкі. Вячэраць лепш таксама гадзін у сямнаццаць.

### Мінімум кавы, максімум морсу

Калі любіце ахалоджвацца мінералкай, бярыце негазаваную. Трэба прасачыць, каб яна была не надта халоднай — інакш кровазварот паскорыцца і цела яшчэ больш павысіць тэмпературу.

Найлепшымі напоямі з'яўляюцца кампоты, морсы і квас. Праўда, квас павінен быць натуральным, а не на водарах. Зялёная і чорная гарбата з лімонам — таксама напой з шэрагу абавязковых. У паўднёвых краінах даўно заўважылі, што «пад гарбату» спёка пераносіцца лягчэй — гарбата ўздымае тэмпературу цела, і вонкавая тэмпература не здаецца такой высокай. Кава не рэкамендуецца, але калі вы не можаце без яе абысціся, можна дазволіць сабе 50-грамовы кубачак молатай чорнай кавы, хоць і такая доза дае вялікую нагрузку на сэрца.

Ад алкаголю лепш адмовіцца — ён яшчэ мацней «сушыць» арганізм. Хаця нямецкія медыкі і рэкамендуюць светлае піва з лёдам, трэба ўлічыць, што піва павінна быць нямоцным і як мага больш якасным.

**Юрась Ускоў**

# З легендаў і казак

У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) праходзіць выстава графікі Паўла Татарнікава «Брама мінулага». Гэта 25 графічных твораў, у якіх мастак асэнсоўвае факты беларускай гісторыі. Аўтар звярнуўся да вобразаў Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Яўхіма Храптовіча. Аднак на карцінах не толькі аблічча гістарычных постацяў: палотны аздоблены краявідамі, знакавымі для абранай гістарычнай асобы будынкамі і прадметамі-сімваламі.

Татарнікаў — ілюстратар. Таму ўсе творы серыі былі выкарыстаныя для афармлення кніг.

«Мастак кнігі павінен быць у пастаянным дыялогу з чытачом, — кажа мастацтвазнаўца Міхал Баразна. — У адрозненне ад мастакоў іншых жанраў, ён павінен любіць чытача, не кідаць яго на волю лёсу, апекавацца ім».

Павал Татарнікаў — плоць ад плоці выхаванец беларускай школы мастацтва.. У яго працах адлюстраваны суплёты менавіта беларускай гісторыі, а сваімі настаўнікамі называе Васіля Шаранговіча і Ігара Славука. Афармляе кнігі па культуры і гісторыі, сярод якіх беларускі пераклад «Аповесці мінулых гадоў» і «Званы Нямігі». Сярод апошніх працаў — аздабленне кнігі Краўцэвіча «Рыцары і дойліды Гародні», выдадзенай у «Гарадзенскай бібліятэцы».

Разам з тым, Татарнікаў — экспартны варыянт беларускага мастацтва. Ён афармляе англійскі эпас пра рыцараў Круглага стала. (Кніга «Артур — кароль Альбіёна».) Гэтая кніжка выйшла ў Вялікай Брытаніі. Татарнікаў афармляе скандынаўскія казкі, казкі братоў Грым, творы Шэкспіра. Даводзіць на справе, што моўныя бар'еры лёгка пераадольваюць візуальныя вобразы. У 2009 на Браціслаўскім кніжным біенале Татарнікаў атрымаў прэстыжны прыз, другі па ліку «Залаты яблык».

«Татарнікаў — гэта прыклад ідэі «любі сваё, трымайся свайго і здабудзеш сусветны поспех», — лічыць мастак Рыгор Сітніца. — Вядома, я не кажу, што трэба зашыцца ў сваёй культуры, не: трэба абняць увесь свет, і, увабраўшы ад іншых культур, давесці сваю вартасць менавіта на сваім матэрыяле. Якраз гэтым і займаецца Павал».

**ЛК**



**Павал Татарнікаў**

Нар. у Брэсце ў сям'і мастакоў у 1971. Вучыўся ў Акадэміі мастацтваў на аддзяленні графікі. З 1997 сябра Саюза мастакоў, з 2001 акадэмік Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.




## Гальшанскі замак

Год Грунвальда багаты на рыцарскія фестывалі. Свята ў Гальшанах пройдзе 21 жніўня. Сёлета фэст прысвячаецца ажно чатыром датам: 730-годдзю заснавання Гальшанаў, 605-годдзю Соф'і Гальшанскай, 600-годдзю перамогі ў Грунвальдскай бітве і 400-годдзю замка.

Чакаюцца масавыя бітвы рыцараў і ўдзел гуртоў, што граюць старадаўнюю музыку, — будуць «Стары Ольса», Litvintroll, Testamentum Terrae, «Келіх Кола». Яшчэ ў праграме — турнір лучнікаў, конны турнір, старадаўнія танцы, конкурсы, фаер-шоу.

Фестываль пачнецца аб 11.00 у мястэчку Гальшаны (Ашмянскі раён). Уваход на тэрыторыю свята будзе каштаваць 25 тысяч рублёў. З Мінска арганізуецца даезд на аўтобусах. **Даведкі па т.: (029) 677-00-46, (017) 200-04-68.**

**КМ**

## Фестываль феерверкаў пад Лагойскам

Другі міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца» пройдзе 27—28 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск». Сваё майстэрства прадэманструюць піратэхнікі з Італіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі. Завершыць фестываль пазаконкурсны гала-феерверк ад беларускай каманды «Кальвін», чэмпіёнаў Еўропы 2007 года.



Музычную частку фестывалю ўзначаляць гурты «Бі-2» і «Акварыум» з Расіі. На фестываль можна будзе даехаць спецыяльным аўтобусам з Мінска ці сваім аўто (маецца паркоўка на тры тысячы месцаў). Кошт квітка на кожны дзень складае 80 тысяч рублёў. **Даведкі і замова квіткоў: (025) 952-45-55 і на сайце www.soundline.by**

**КМ**

### КАНЦЭРТЫ

**Tanin Jazz**

**11 жніўня ў клубе «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — канцэрт гурта Tanin Jazz. **Пачатак а 19-й.**

**Закрыццё фестывалю «Дах»**

Клубнае закрыццё фестывалю «Дах–XI» адбудзецца **14 жніўня ў клубе Fabrique (вул. Мяснікова, 25)**. Выступаюць **Verba**, **«Из кожи Вон»**, **«Князь Мышкин»**, **Ritual Dub**, **VoKal**, **B.O.M.**, **BlackPaperPlanes**. Квіткі 10 000 — 15 000 руб. **Пачатак а 18-й.**

### ВЫСТАВЫ

**Неонавая прастора**

**Да 30 жніўна ў Галерэі TUT.BY (вул.В.Харужай, 1а)** працуе выстава «Неонавая прастора». Экспазіцыя прадстаўленая творамі графікі, жывапісу і скульптуры творчай супольнасці «Неонавая галава».

**«Песняры». Раскрытае сэрца**

**У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав. Музычны, 5) да 1 верасня** праходзіць выстава «Песняры». Раскрытае сэрца», на якой прадстаўленыя нотныя рукапісы У.Мулявіна, фотаздымкі, афішы, конкурсныя прызы, дыпломы і сцэнічныя касцюмы «Песняроў».



**Жывапіс Юдаля Пэна**

**Тамсама да 26 жніўня** працуе выстава жывапісу Юдаля Пэна. На выставе экспануюцца 33 творы мастака са збораў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

**Народжаныя морам**

**У гомельскай мастацкай галерэі Г.Вашчанкі (вул.Карповіча, 4) да 20 жніўня** працуе выстава «Народжаныя морам», дзе можна ўбачыць ракавіны разнастайных памераў і колераў, каралы… Усяго больш за 900 экспанатаў.

**Шлях на Грунвальд**

**13 жніўня а 17-й у галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** — адкрыццё калектыўнай фотавыставы «Шлях на Грунвальд», прысвечанай 600-годдзю вялікай бітвы. У экспазіцыі больш за 60 работ вядомых беларускіх майстроў фатаграфіі.

**Саюз расійскіх мастакоў**

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) да 28 жніўня** працуе выстава «Саюз расійскіх мастакоў. Новы час». На выставе прадстаўленыя 74 творы жывапісу і графікі 35 аўтараў з 14 гарадоў Расіі.

**Паэзія ў будзённасці**

**У Мастацкім музеі да 30 жніўня** працуе рэтраспектыўная выстава жывапісу Барыса Казакова «Паэзія ў будзённасці».

**Гіганты Ледавіковага перыяду**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы аднаўлены па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя камп'ютарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць!

**Беларускія ўзоры**

**У Музеі народнага мастацтва (Раўбічы) да 31 жніўня** працуе выстава «Беларускія ўзоры»: пляценне з прыродных матэрыялаў, кераміка, аплікацыя саломкай, ручная коўка, разьба па дрэве.

**Свет з вышыні**

**У Доме-музеі Ваньковічаў (вул.Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных мапаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні».

### КІНО

## Апошні фільм Рамана Паланскага

**Прывід** (The Ghost Writer)

Вялікабрытанія — Нямеччына — Францыя, 2010, каляровы, 128 хв.

**Рэжысёр:** Раман Паланскі

**Ролі выконваюць:** Юэн МакГрэгар, Пірс Броснан, Джэймс Белушы

**Жанр:** Палітычны трылер

**Адзнака:** 7,5 (з 10)




Пісьменнікамі-прывідамі называюць людзей, якія пішуць за іншых кнігі. Паводле сюжэта фільма, былы брытанскі прэм'ер Адам Лэнг наймае такога «літаратурнага негра», каб той завершыў ягоную біяграфію. Папярэдні пісьменнік, які з ёй працаваў, загадкава патануў.

Сціплы «прывід», які не мае ні сям'і, ні дзяцей і палітыкай не цікавіцца, трапляе ў вір палітычных канфліктаў.

Гэта апошняя стужка Рамана Паланскага, які кіраваў мантажом з турэмнае камеры.

У палітычным трылеры «Прывід» вельмі рэдка страляюць. Бедныя і дэкарацыі: самотная выспа і мінімалісцкі будынак-крэпасць, за шыбамі якога заўжды дождж. Рэжысёр засяроджваецца на чыстым трымценні, калі загадкі абвальваюцца на чалавека, таямніцы зацягваюць, а сусветныя скандалы разыгрываюцца за кулісамі прыватнага дома.

Герой Юэна МакГрэгара, як герой «Піяніста» дый сам рэжысёр фільма, робіцца ўдзельнікам знакавых падзей насуперак уласнай волі. Майстэрства рэжысёра ператварыла простую, амаль плакатную палітычную гісторыю ў прыпавесць.

**Андрэй Расінскі**

# Тры беларускія каманды ў плэй-оф Лігі Еўропы

Сёлетні еўракубкавы сезон удалы для беларускіх клубаў.

З чатырох прадстаўнікоў нашай краіны барацьбу працягваюць трое. Толькі жодзінскае «Тарпеда» саступіла сербскаму ОФК.

Зрэшты, для БАТЭ ўдзел у плэй-оф Лігі Еўропы — гэта зусім не тое, да чаго імкнуўся клуб. У Лізе чэмпіёнаў барысаўцы саступілі дацкаму «Капенгагену».

Ужо ў сярэдзіне першага тайма каманда Віктара Ганчарэнкі ў дацкай сталіцы гарэла без варыянтаў — 0:2. Але намаганнямі Канцавога і Няхайчыка нечакана адыграліся. Нічыя была на карысць беларусаў, але ўтрымаць яе не ўдалося.

У пачатку другога тайма Радзівонаў свой шанец не рэалізаваў, а вось настырны сенегалец Н'дое шлях да брамы Сяргея Верамко знайшоў. З надзеяй на Лігу чэмпіёнаў трэба развітацца мінімум на год.

БАТЭ, такім чынам, апусціўся ў плэй-оф Лігі Еўропы. Там яму кампанію склалі мінскае «Дынама» і магілёўскі «Дняпро».

Асабліва прыгожую перамогу атрымалі «дынамаўцы», і выйгралі яны не ў абы-каго, а ў леташняга ўдзельніка групавога этапа Лігі чэмпіёнаў «Макабі» (Хайфа).

На Зямлі абяцанай мінчане саступілі 1:0. З прапушчанага гола пачаўся матч і дома. Але выключная гульня паўабаронцы Антона Пуцілы дазволіла «Дынама» перамагчы — 3:1. На рахунку Антона — два галы і галявая перадача. Прычым апошні гол Пуціла забіў са штрафнога на апошняй хвіліне гульні.

«Макабі» ж пагарэла на сваёй самаўпэўненасці.

Што да Пуцілы, то зусім нядаўна ён і калега Сяргей Кісляк па распараджэнні дырэктара «Дынама» бізнесмена Юрыя Чыжа не выходзілі на поле. У абодвух гульцоў зімой канчаюцца кантракты, то бок новым клубам яны дастануцца задарма. Чыж жа хоча прадаць іх як мага даражэй. А найбольшыя грошы за беларускія таленты прапаноўваюць у сонечным Краснадары. Кісляк з Пуцілам ехаць туды не хочуць. Вось такая канфліктная сітуацыя.



Антон Пуціла (у бурацінаўскай шапцы) з трэнерам «Дынама» пасля перамогі над «Макабі».

Гаротны «Дняпро» нават не меў грошай, каб замовіць да Чэхіі чартэр. Давялося ехаць аўтобусам у Астраву, каб сустрэцца з мясцовым «Банікам». Падарожжа кандыцыю магілёўскіх футбалістаў не пагоршыла: як і тыдзень таму, «Дняпро» аказаўся мацнейшы — 2:1.

У еўракубкавыя перспектывы «Дняпра» ўвогуле верылася з цяжкасцю, а ён сенсацыйна перамог нарвежскі «Стабэк» і чэшскі «Банік».

Увогуле беларусы маюць пакуль сёлета трэці еўрапейскі рэйтынг — вышэй толькі аўстрыйцы і сербы.

Матчы плэй-оф пройдуць 19 і 26 жніўня. У выпадку перамог Беларусь чакае трэцяя запар футбольная еўрапейская восень.

**Зміцер Панкавец**

# Плацкарта новай серыі

Плацкартны вагон: ці ёсць у яго будучыня?

Два тыдні таму Крукаўскі вагонабудаўнічы завод прэзентаваў плацкартны вагон новага тыпу, выраблены спецыяльна для Беларусі. Розніца паміж новым і старым вагонам у наяўнасці лесвіцы з першай на другую паліцу, напаўзакрытасці купэ, наяўнасці кандыцыянера і душа ў адной з прыбіральняў, а таксама электронным табло з інфармацыяй. Хутка вагон пойдзе ў серыйны выпуск, а пакуль што нам давядзецца працягваць ездзіць у «класічнай плацкарце».

## Плюсы

Некаторыя называюць плацкарту савецкім перажыткам. Іншыя ж лічаць плацкарту «добрай вынаходкай». Само слова плацкарта ў перакладзе з нямецкай абазначае «картку, што дазваляе займаць пранумараванае месца ў вагоне». У Беларускай чыгунцы так называюць танныя спальныя вагоны.

Плюс у плацкарты — цана. Для таго і вынайшлі ў савецкія часы звыклую нам канструкцыю — каб сярэдні грамадзянін без лішняга камфорту, але зручна мог даехаць, куды яму патрэбна. Плацкарта выгодная і тым, што месцы можна выкарыстоўваць як спальныя і сядзячыя адначасова.

Іншы плюс, па словах аматараў плацкарты, у свабодным прытоку паветра. Калі ваш сусед па купэ будзе есці курыцу ці яшчэ штосьці з моцным пахам, ўратавацца будзе складана — маленькае памяшканне хутка прасякаецца пахамі. У плацкарце ж усё адбываецца па-іншаму — пахі знікаюць, бо паветра ўвесь час «перамяшчаецца».

## Мінусы

Затое чалавек застаецца ўвесь час навідавоку.

Па-другое, кантраляваць асабістыя рэчы складаней. Спадзявацца на замкнёныя дзверы, як у купэ, не даводзіцца. Класічны прыклад — скрадзены абутак, у выніку чаго пасажыры выходзяць на перон у тапках.

Наступны мінус датычыць як плацкартных, так і купэйных вагонаў: у цягніках савецкага тыпу была нікуды не вартая сістэма кандыцыянавання, а засаўкі на вокнах працавалі туга. Вагоны Беларускай чыгункі выгадна розняцца ад украінскіх і расейскіх — дагледжаныя і акуратныя, і дзіркі ў даху ў нашых цягніках не сустракаюцца. Але з вокнамі сітуацыя дагэтуль не радасная.



### З каментароў на nn.by

А я люблю плацкарту. Сама тое для нашых адлегласцяў. Пакуль еду да Гомеля, пасплю гадзінку, а пасля пасяджу папрацую. У сядзячым ці ляжачым ці першае, ці другое немагчыма. Не ўсё старое — благое.

**Іван**

### А ці трэба нам плацкарта?

Упершыню спрэчка пра запатрабаванасць плацкартнага вагона разгарэлася ў 2003 годзе, калі Уладзімір Якунін, кіраўнік Расейскай чыгункі, выказаў меркаванне, што далей карыстацца гэтым перажыткам савецкага часу немэтазгодна.

Галоўнай прапановай Якуніна было замяніць плацкартныя вагоны на кушэткавыя, якімі карыстаюцца ў Еўропе. Розняцца яны ад плацкартных тым, што, замест чатырох «купэйных» паліц, маюць шэсць, а бакавых не маюць увогуле. Пасажыр у іх заўжды знаходзіцца ў ляжачым стане. У Еўропе такія вагоны выкарыстоўваюцца для начных пераездаў, і разлічана, што пасажыр у іх спіць. А калі дарога не ўкладаецца ў адну ноч, то зранку можна перасесці ў цягнік іншага тыпу. Але такая сістэма нязручная для вялікіх адлегласцяў Еўразіі, таму плацкарт, мусіць, не знікне.

Новыя купэйныя вагоны, што паявіліся на беларускіх маршрутах, рэзка ўзнялі планку камфортнасці. Чарга за новай плацкартай.

**Юрась Ускоў**

### Парады тым, хто едзе ў плацкарце

1. Імкніцеся ўзяць ніжнюю паліцу. Дах вагона праграваецца вельмі хутка, а набліжанасць да кандыцыянера не дасць вам нічога.
2. Папрасіце ў касах білет у новы вагон. Касіркі ведаюць, які з вагонаў новы, і з задавальненнем дапамагаюць.
3. Трымайце дакументы ў торбе, а торбу — у скрынцы пад сядзеннем. Тое самае рэкамендуецца рабіць з абуткам, асабліва ноччу.
4. Не забывайцеся, што вы маеце законнае права не слухаць радыё і што вы можаце патрабаваць уключыць кандыцыянер.

## З-ПАД ЗЯМЛІ

### У Мінску адновяць рэчышча Нямігі

На тэрыторыі былога Мінскага замчышча створаць гістарычна-археалагічны цэнтр. План будучага музея пад адкрытым небам будзе гатовы ўжо да канца года. На тэрыторыі паміж праспектам Пераможцаў і Свіслаччу адновяць частку збудаванняў XII ст.

Адновяць і частку рэчышча летапіснай Нямігі. Звыродлівы Дом фізкультурнікаў, наадварот, маюць знесці.

**СГ**

## ВАЗЬМІ ТЫ З САБОЮ МЯНЕ

### «Белавія» адкрывае рэйсы ў Батумі

З 15 верасня «Белавія» пачне лятаць на чарнаморскі курорт Грузіі. Рэйс Мінск—Батумі—Мінск будзе выконвацца два разы на тыдзень — у серады і нядзелі на самалёце Боінг — 737/500 з абслугоўваннем па бізнес- і эканом-класах.

**СГ**

## СМАКІ

### Як выбраць кавун

Здаровы кавун заўсёды іскрыцца крупінкамі.

Беларусь знаходзіцца паблізу ад рэгіёнаў вырошчвання самых смачных кавуноў. Таму ў сезон мы маем магчымасць ласавацца гэтай карыснай ягадай. (Так-так, кавун — гэта па класіфікацыі — вялікая ягада.) Аднак лёгкасць вырошчвання прыводзіць да спробаў фальшавання. Несумленныя сяляне выганяюць вялікія кавуны з дапамогай нітратаў. Несумленныя гандляры прыспешваюць тэрміны даспявання ўпырскваннем марганцоўкі ці конскай мачы.

Вызначыць спеласць і натуральнасць кавуна няпроста. Дакладных крытэраў тут няма.

Пэўна, што плод павінен быць яркага, а не бляклага колеру. Навобмацак ён не мусіць быць мяккаватым. Сухі хвосцік — яшчэ адна прыкмета спеласці. Гук пры пастукванні? Тут трэба мець добрае вуха: ён павінен гучаць гулкавата, не глуха. Сцісніце яго дзвюма рукамі — спелы затрашчыць.

Яшчэ істотная прыкмета якасці — жоўты (а не белы) колер земляной пляміны на баку кавуна. Акрамя таго, можна пацерці бок і панюхаць яго.

Выразны травяны пах выдае благі смак.

Ніколі не надразайце нямытыя кавуны. Гэта небяспечна для здароўя. І ў той жа час не шкадуйце, выкідайце кавун, які выклікаў падазрэнні пасля разразання дома. Здаровы кавун заўжды іскрыцца крупінкамі. А калі апусціць кавалачак у ваду і яна пры гэтым памутнее і не афарбуецца ў ружовы колер, значыць, кавун нармальны.

**СГ**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Кавалак бараніны, прыгатаваны, як кавалак аленя

1 задняя частка барана, 200 г саланіны, воцат, па 0,5 чайнай лыжачкі простага і духмянага перцу, 10—12 лаўровых лістоў, трохі ядлаўцовых ягад, 3—4 цыбулі, 2—3 морквы, 1 пятрушка, 1 парэй, 1 шклянка віна, 0,5 лімона, 1 лыжка каперсаў, 1 лыжка масла, 1—1,5 шклянкі булёну, 0,5 лыжкі мукі.

Вялікую заднюю частку барана замарынаваць на некалькі дзён у закіпячоным воцаце з карэннем. Выцягнуць, адціснуць марынад, нашпігаваць саланінай і тушыць на малым агні, дадаўшы нарэзанай цыбулі, саланіны, трохі ядлаўцовых ягад,螺 рознага карэння і булёну або віна. Пры падачы заліць моцным булёнавым соусам, змяшаным з соусам ад смажаніны, папярэдне працэджаным. Дадаць у соус лімон, каперсы або аліўкі.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Шчыра віншуем найдаражэйшых людзей Станіслава Вацлававіча і Веру Іванаўну Герко** з 45-годдзем сумеснага жыцця. Сардэчна жадаем Божай апекі, людской спагады, моцнага здароўя. Родныя.

**ПАКОЙ**

**Беларускамоўная сям'я** ў складзе мужа і жонкі здыме 1-пакаёвую кватэру ў Мінску. Т.: (025) 935-11-41.

**Студэнткі здымуць** кватэру ці пакой. Т.: (033) 602-93-91.

**КНІГІ**

**Куплю** кнігу: «Гісталогія з асновамі цыталогіі і эмбрыялогіі». Арцішэўскі А.А. Т. (029) 383-34-92 Валер.

**Зборнікі** вершаў В.Трэнас, А.Хадановіча, «Тэксты» 2004, 2007 г. прадам. Т.: (029) 332-69-56. Святлана.

**ПРАДАМ**

**Прадам дачу.** 15 км ад МКАД. Лагойскі кірунак. Т.: (029) 569-79-90.

**ПРАЦА**

**Шукаю беларускамоўную няню** для хлопчыка 1 года на 5 гадзін на дзень. Уручча. Т.: (029) 662-69-09. Юлія.

**Шукаю выкладчыка** матэматыкі для заняткаў з вучнямі 8-9 класаў. Т.: (029) 774-22-47.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Што бывае з козлікам пасля шасці гадоў?

2) Калі апоўдні ідзе дождж, то ці можна праз 36 гадзін чакаць сонца?

3) Калі мы глядзім на «5», а кажам «17»?

4) Якім ключом нельга адамкнуць дзверы?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**




У Лідзе так спяшаюцца падрыхтавацца да «Дажынак», што паўметровыя калюжыны закатваюць асфальтам.



Адна ахвяра, тысячы вёсак без электрычнасці, завалы на дарогах — над краінай у нядзелю праляцеў ураган. Вецер пашкодзіў дахі амаль 400 дамоў, павыварочваў дрэвы. У дадатак да ветру на паўночным захадзе Беларусі выпаў град з арэх. Пабіў машыны, стрэхі, сайдынг на дамах. І нават шыльду мясцовага МНС.



Жыхары Віцебска сталі сведкамі рэдкага відовішча: цэнтр горада запаланілі мільёны матылькоў.



## Бернд Штанге пажадаў «Гавары праўду!» поспехаў

Сябры кампаніі «Гавары праўду!» нечакана для сябе сустрэліся ў гэтую пятніцу з галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе Берндам Штанге.

— Гэта было вельмі неспадзявана для ўсіх нас, — распавядае актывіст кампаніі Алег Мяцеліца. — Мы адпачывалі ў кавярні насупраць канцэртнай залы «Мінск», снедалі. Нечакана да ўсіх нас падышоў чалавек, павітаўся і ветліва сказаў: «Смачна есці!» І адышоў убок... Мы адразу пазналі ў ім вядомага трэнера беларускай зборнай па футболе Бернда Штанге. На шчасце, у нас якраз была торба з лагатыпам кампаніі «Гавары праўду!». Падыходзім да гера Штанге і кажам: маўляў, мы вялікія аматары футбола і заўсёды хварэем за беларускую зборную! Падарылі сумку трэнеру і пажадалі, каб пад яго кіраўніцтвам каманда і надалей ішла да перамог! Бернд Штанге быў вельмі ветлівым, пажадаў нам таксама поспехаў ва ўсіх справах, а таксама дасягнення пастаўленых мэтаў! Запрасіў, дарэчы, нас на матч Беларусь — Літва 11 жніўня, які пройдзе ў Коўне.

Пра кампанію «Гавары праўду!» гер Штанге, пачуў упершыню, але з задавальненнем зазначыў: казаць праўду — гэта здорава!



Ля Смаргоні згарэла расійская фура. Выбухнуў паліўны бак. Кіроўца, на шчасце, паспеў спыніць палаючую машыну, а потым з яе выскачыў.

## Анекдоты

* * *

Вайсковец прыходзіць дамоў, а яму жонка з парога кажа:
— Ну што, расфармоўваюць вашу часць?
— Ды ты што! Хто табе сказаў?
— Баба Маня на кірмашы казала.
— Глупства якое! Я камандзір, я лепш ведаю!
На наступны дзень прыходзіць дадому:
— Люба, схадзі на кірмаш, дазнайся ў бабы Мані, куды мяне пераводзяць...

* * *

— У мяне блізарукасць —3 і —3,5.
— А ў мяне —4,5 ... Мяне можна без акуляраў у жаночую лазню запускаць.

* * *

Махмуд Ахмадзінеджад заявіў, што яму вядомыя 400 параўнальна сумленных спосабаў узбагачэння ўрану.

* * *

Пісьменнік на нейкім прыёме абняў даму, пацалаваў яе і сказаў:
— Прабачце, справа ў тым, што Вы вельмі падобная да маёй жонкі.
— Вы нахаба, дурань і п'яніца!
— Гэта трэба ж! Вы нават гаворыце, як мая жонка!..

* * *

— Сямёнаўна, у краму жывых карпаў завезлі!
— Ну, значыць мой проста з раніцы на рыбу выправіцца.

* * *

Арыентавацца ў «каменных джунглях» вялікіх гарадоў проста: поўдзень можна вызначыць па сценах дамоў, на якіх асабліва бурна растуць кандыцыянеры.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Паміж Магілёвам і Лоевам** не ходзяць параходы, бо ў Дняпры ад засухі дужа мала вады.

**«НН». №30. 1910**

**На Усебеларускі з'езд за незалежнасць** сабраліся 1350 дэлегатаў замест меркаваных 800. Людзей да апошняга дня вылучалі працоўныя калектывы, вайсковыя часці, грамадскія аб'яднанні. У выніку зала, не разлічаная на такую колькасць людзей, аказалася набітая пад завязку. Дэлегаты сядзелі ў праходах, на лесвіцах, стаялі ў дзвярах, і ўсё адно ахова пад 10-ю на запатрабаванне пажарнікаў мусіла спыніць доступ дэлегатаў у залу — частка засталася слухаць пасяджэнне ў фае. Панавала ўрачыстая атмасфера. Ужо першае прывітанне з'езду ад Васіля Быкава, зачытанае Генадзем Бураўкіным, які старшыняваў з раніцы, выклікала бурную авацыю. Людзі стоячы скандавалі «Жыве Беларусь». Тое самае паўтарылася пасля зачытвання прывітальнай тэлеграмы ад прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гаўла.

**«НН». №31. 2000**

**Адказы да старонкі 15.**
1) Пойдзе сёмы год. 2) Не, бо гэта будзе ноч.
3) Калі глядзім на гадзіннік а 5-й гадзіне дня.
4) Скрыпічным.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6365.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 10.08.2010.
Замова № 3889.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614